ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 3-ці
№ 30 (2390)
15 красавіка 1969 г
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ДОБРЫЯ СЯБРЫ КНІГІ

У Мінску ў Доме мастацтваў адбылося гарадское свята кнігалюбаў. Яго адкрыў сакратар гаркома камсамола А. Радомскі. Пра добрыя справы мінскіх кнігалюбаў расказаў намеснік дырэктара аблкнігагандлю А. Варфаламееў. У сталіцы рэспублікі звыш 1400 чалавек распаўсюджваюць кнігі на грамадскіх пачатках. Летась яны прадалі рознай літаратуры на 46 тыс. рублёў. Разам з работнікамі аблкнігагандлю энтузіясты ўдзельнічалі ў 88 кніжных кірмашах і 470 выездах на прадпрыемствы і будоўлі сталіцы, што дало магчымасць дадаткова рэалізаваць літаратуры на 100 тыс. рублёў.

Юныя кнігалюбы мінскай школы № 69 распаўсюдзілі сярод насельніцтва 100 бібліятачак, укамплектаваных ленінскай літаратурай. Актыўна вядуць прапаганду ленінскай літаратуры работнікі Цэнтральнага кніжнага магазіна, камсамольскія арганізацыі Мінскага рэзерва праваднікоў і многія іншыя.

Лепшыя кнігалюбы на вечары былі ўзнагароджаны значкамі «Прапагандыст кнігі», а калектывы — Ганаровымі граматамі ЦК ЛКСМ Беларусі.

«ЛІТЕРАТУРНОЙ ГАЗЕТЕ» — 40 гадоў

«Літаратурная газета» і яе шматлікія чытачы адзначаюць слаўны юбілей — 40 гадоў назад, у красавіку 1929 года, выйшаў першы нумар «Літаратурки». Сорак гадоў — сорак гадавых камплектаў. У іх — гісторыя літаратурнага і грамадскага жыцця нашай краіны, летапіс важнейшых падзей, якімі жыў наш народ, летапіс гераічных гадоў. На яе старонках адлюстравалася ўсё тое, чым жылі савецкая літаратура і мастацтва ўсе гэтыя гады, у ёй пабачылі свет многія выдатныя творы савецкіх пісьменнікаў, яна засведчыла няўхільны рост і сталенне шматнацыянальнай савецкай літаратуры, літаратуры сацыялістычнага рэалізму. «Літаратурная газета» на працягу ўсяго саракагадовага шляху была актыўнай творчай і грамадскай трыбунай савецкіх літаратараў, яна рашуча і паслядоўна змагалася за ажыццяўленне палітыкі партыі ў галіне літаратуры і мастацтва, адстойвала прынцыпы сацыялістычнага рэалізму, вяла барацьбу з упадніцкім буржуазным мастацтвам, расказвала сваім чытачам аб творчасці прагрэсіўных пісьменнікаў усяго свету.

Гэтыя слаўныя традыцыі «Літаратурная газета» працягвае і сёння. «Літаратурка» — добры і надзейны сябра і паўнамоцны прадстаўнік літаратур народаў нашай краіны, даўні памочнік і дарадца пісьменнікаў усіх братніх савецкіх рэспублік, яе ведаюць і паважаюць мільёны савецкіх чытачоў.

І таму 40-годдзе «Літаратурной газеты» адзначаюць, як сваё свята, усе яе сябры.

Горача віншуюць «Літаратурку» са слаўным юбілеем літаратары Савецкай Беларусі. У прывітальным адрасе праўлення Саюза пісьменнікаў БССР калектыву «Літаратурной газеты» гаворыцца, у прыватнасці: «Сорак гадоў «Літаратурка», з'яўляецца рупарам шматнацыянальнай сям'і савецкіх пісьменнікаў, знаходзіцца на перадавой пазіцыі ідэалагічнага фронту, нязменна адстойвае ленінскія прынцыпы ў літаратуры, змагаецца з усім чужым, наносным, што перашкаджае выхаванню новага чалавека — актыўнага будаўніка камунізма. Газета карыстаецца заслужанай папулярнасцю ва ўсіх кутках Савецкага Саюза, у тым ліку і ў нас у Беларусі, адыгрывае велізарную ролю ў камуністычным выхаванні грацоўных. Да яе голасу прыслухоўваюцца, яе любяць.

Ад усёй душы жадаем калектыву супрацоўнікаў «Літаратурной газеты» і яе шматлікаму аўтарскаму актыву новых творчых поспехаў».

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» таксама горача віншуе і вітае сваю старэйшую сястру — «Літаратурную газету» — з юбілеем, зычыць ёй новых поспехаў у пачэснай і адказнай службе на карысць шматнацыянальнай савецкай літаратуры.

ДАРАГАЯ ДАТА

ЭТЫ ДЗЕНЬ — заўсёды ўрачысты, радасны і трошкі журботны.

Урачысты — таму што чым далей, тым яскравей і паўней паўстае перад намі значэнне здзейсненага савецкім народам у Вялікую Айчынную вайну. А воінскі і партызанскі подзвіг Беларусі ў тыя суровыя гады стаў легендай, якая да гэтага часу выклікае і будзе яшчэ доўга-доўга выклікаць захапленне.

Радасны — таму што неяк асабліва выразна відаць нам у гэты дзень, у што ператварылі і ператвараем мы зямлю, якая ў ліпені 1944-га ляжала зруйнаваная і спапялёная.

Журботны — таму што ён напамінае пра тое, чым, якой невымернай цаной заплацілі мы за сваё вызваленне, за свабоду і шчасце.

Дваццаць пяты раз мы будзем адзначаць сёлета Дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дваццаць пяты раз на нашых календарах будзе зноў тое самае чысло, якое было, калі скрозь воблакі парахавога дыму ўварваліся на вуліцы Мінска танкі з чырвонымі зоркамі на вежах і над цудам уцалелым Домам урада пад чыстым сінім небам зноў — назаўжды! — зазлунаў чырвоны сцяг Саветаў.

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі пастанавіў правесці святкаванне гэтай урачыстай даты пад знакам непахіснай вернасці працоўных ідэям Леніна, справе камунізма, гатоўнасці моладзі свята захоўваць і памнажаць баявыя і працоўныя традыцыі партыі і народа.

Камуністычная партыя была натхніцелем і арганізатарам барацьбы і перамог беларускага народа ў Вялікую Айчынную вайну. Закліканыя і згуртаваныя партыяй, больш мільёна беларусаў сталі салдатамі-франтавікамі, звыш 440 тысяч — партызанамі і падпольшчыкамі. «Асабістым прыкладам, мужнасцю і гераізмам камуністы вялі за сабою няскораны народ Беларусі,— гаварыў у дакладзе на ўрачыстым пасяджэнні ЦК КП Беларусі і Вярхоўнага Савета БССР, прысвечаным 50-годдзю БССР і КПБ, кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі П. М. Машэраў.— Дзесяць падпольных абкомаў, 185 міжраёнкамаў, гаркомаў і райкомаў партыі, звыш 1 300 первічных партыйных арганізацый аб'ядналі больш як 35 тысяч камуністаў. Гэта былі арганізуючыя цэнтры, аператыўныя штабы ўсенароднай барацьбы. Праз грозныя гады вайны Кампартыя Беларусі з гонарам пранесла высокае званне баявога атрада КПСС».

Вось чаму, рыхтуючыся да слаўнай даты вызвалення, плануючы вечары, сустрэчы, выстаўкі, работнікі і актывісты культурна-асветных устаноў павінны асаблівую ўвагу звярнуць на тое, каб у мерапрыемствах гэтых дастойнае месца заняла тэма яднання партыі і народа, тэма вядучай ролі камуністаў у ратных і працоўных подзвігах нашых. Гэта тым больш важна, што святкаванне 25-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прыпадае на год, калі краіна жыве набліжэннем гістарычнага ленінскага юбілею.

Святкаванне 25-годдзя вызвалення ставіць перад культасветустановамі вялікія і пачэсныя задачы. Міністэрства культуры рэспублікі аддало загад, у якім пра задачы гэтыя гаворыцца дэталёва і канкрэтна.

Палацам і дамам культуры, клубам, музеям, паркам рэкамендуецца арганізоўваць лекцыі, даклады, гутаркі, тэматычныя вечары, сустрэчы працоўных з удзельнікамі баёў за вызваленне Беларусі і ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. У кожным горадзе, у кожным раёне ёсць людзі, якім давялося з вінтоўкай на плячы хадзіць па дарогах ахопленай полымем вайны Беларусі. Як многа могуць яны расказаць цікавага і павучальнага, асабліва для моладзі. Вось і знайдзі такіх людзей, культработнік! Памажы ім вызначыць вэ ўспамінах галоўнае, стройна пабудаваць свой расказ.

У апошнія гады крылатыя словы «Ніхто не забыты і ніштo не забытае» набылі асабліва шырокую папулярнасць. Самі ветэраны вайны, моладзь, «чырвоныя следапыты» — школьнікі вядуць няспынны, настойлівы пошук, каб не было невядомых герояў, не было безымянных салдацкіх і партызанскіх магіл. Колькі яскравых старонак слаўнага летапісу змагання, колькі выдатных подзвігаў вырваны з забыцця ў выніку гэтых пошукаў! Хай жа ў дні падрыхтоўкі да слаўнай гадавіны вызвалення расказы пра іх, знойдзеныя рэліквіі зоймуць ганаровае месца на стэндах і выстаўках, у клубах, бібліятэках, дамах культуры, музеях. Хай кожная культасветустанова зробіць усё, каб пераканаўча паказаць, што баявыя подзвігі здзяйсняліся не дзе-небудзь за трыдзевяць зямель, а тут, у гэтым самым гарадку, можа, на той самай вуліцы, якую іншы з наведвальнікаў лічыць нецікавай і будзённай.

А як многа трэба зрабіць тэатрам, канцэртным арганізацыям, музычным калектывам! Два з паловай месяцы, што аддзяляюць нас ад 3-га ліпеня — даты вызвалення — тэрмін, вядома, вельмі невялікі. І ўсё-такі можна (і трэба!) паспець зрабіць многае. Хай народзяцца новыя спектаклі, канцэртныя нумары, песні пра подзвіг беларускага народа ў змаганні з азвярэлай фашысцкай навалай. Хай з новай сілай загучыць лепшае з народжанага раней — у рэпертуары нашых творчых калектываў нямала цудоўных работ, прысвечаных гэтай хвалюючай тэме.

Шмат ініцыятывы, харошай выдумкі, цікавых пачынанняў з'явілася ва ўстановах культуры і мастацтва Беларусі ў час падрыхтоўкі і святкавання 50-годдзя БССР і КПБ. Вопыт гэты можа прынесці шмат карысці і дапамогі і цяпер, калі ў планах сваіх мы чырвоным колерам адзначылі лічбу 3-е ліпеня.

ЧЫТАЧ АЦЭНЬВАЕ, РАІЦЬ, КРЫТЫКУЕ

У Магілёўскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна адбылася канферэнцыя чытачоў газеты «Літаратура і мастацтва». Удзельнікі яе — работнікі бібліятэк вобласці, клубных устаноў, абласнога ўпраўлення культуры і абласнога Дома народнай творчасці — са шчырай зацікаўленасцю гаварылі аб паляпшэнні работы газеты, давалі ацэнку змешчаным на працягу апошніх двух-трох гадоў матэрыялам.

Сваімі думкамі аб асвятленні культурнага жыцця рэспублікі ў газеце падзяліліся загадчыцы абанементаў: Касцюковіцкай раённай бібліятэкі — К. Бязбабіч, Бабруйскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага — М. Каган, Глускай раённай бібліятэкі — Р. Чорнагубоўская, метадыст абласнога Дома народнай творчасці А. Голыш, студэнтка 4-га курса бібліятэчнага факультэта Мінскага педінстытута імя М. Горкага А. Лук'янёнак, намеснік дырэктара абласной бібліятэкі П. Касцерава, намеснік начальніка абласнога ўпраўлення культуры З. Лысенка і начальнік абласнога ўпраўлення культуры П. Давыдаў — усяго пятнаццаць чалавек.

У рабоце канферэнцыі чытачоў прыняў удзел загадчык аддзела культуры «Літаратуры і мастацтва» П. Місько. Ён адказаў на пытанні ўдзельнікаў канферэнцыі і расказаў аб планах работы рэдакцыі на сёлетні год.

В. АРЦЕМ'ЕЎ.

БУДНІ МАСТАКОЎ

ТЫДЗЕНЬ ТВОРЧЫХ СУСТРЭЧ

Сёлета ў Беларусі традыцыйны Тыдзень выяўленчага мастацтва пачаўся ў абласных цэнтрах 14 красавіка, а ў Мінску пачнецца 18 красавіка.

Наш карэспандэнт папрасіў адказнага сакратара Саюза мастакоў БССР В. Вярсоцкага расказаць пра асноўныя мерапрыемствы веснавога свята мастацтва.

— Гэты тыдзень, — сказаў В. Вярсоцкі, — багаты на выстаўкі. Да ўрачыстага адкрыцця тыдня ў Мінску мы разгорнем у памяшканні ЦК ЛКСМБ вялікую выстаўку фотарэпрадукцый твораў беларускай манументальнай скульптуры. На гэтым вернісажы гледачы сустрэнуцца з вядучымі скульптарамі рэспублікі.

«Вобраз У. І. Леніна ў савецкім выяўленчым мастацтве» — так называецца экспазіцыя рэпрадукцый у сталічнай бібліятэцы «Юнацтва». «Па ленінскім шляху» — дэвіз вернісажа, які адбудзецца ў Магілёве.

Групавыя паказы твораў беларускіх мастакоў наладжваюцца ў Нясвіжы і ў Палацы культуры трактарнага завода ў Мінску. Выстаўкі твораў беларускай графікі адбудуцца ў саўгасе «Краснае» на Маладзеччыне, на Бярозаўскай ДРЭС, у мінскім кінатэатры «Навіны дня».

Вялікую мастацкую выстаўку ў Маладзечна наладжваюць мясцовыя майстры пэндзля і разца. У дні тыдня слушкія аматары мастацтва пазнаёмяцца з творамі М. Даўгялы і У. Сазкалова, гродзенцы — з творчасцю Я. Красоўскага. На атамным рэактары АН БССР трымаюць творчую справаздачу графікі Н. і Г. Паплаўскія. Творы сатырычнай графікі будуць экспанавацца ў мінскім кінатэатры «Беларусь», а ў Доме партасветы разгортваецца паказ агітплакатаў.

Мінскі мастацкі салон-магазін наладзіць у дні тыдня выстаўку-продаж вырабаў прадпрыемстваў Мастацкага фонду БССР.

Вызначаны ўжо тэрмін «дзён адчыненых дзвярэй» у майстэрнях мінскіх мастакоў. Жывапісцы і графікі будуць прымаць гасцей 22 красавіка, а скульптары — 24.

У дні тыдня беларускія майстры ўрачыста перададуць шэраг сваіх твораў у дарунак прадпрыемствам і музеям.

Сёлетні Тыдзень выяўленчага мастацтва абяцае быць цікавым, змястоўным.

Некалькі дзесяткаў магазінаў, рэстаранаў, кафэ і сталовых афармлена за гэты год мастацкімі майстэрнямі пры Гомельскім абласпажыўсаюзе.

На здымку — мастакі М. Чуешкаў, Р. Каракуз, Н. Сафрончанкава і А. Каламійцаў за абмеркаваннем эскізаў афармлення магазіна «Дары прыроды» ў Гомелі.

Фота У. МЯЖЭВІЧА.

Да юбілею Ільіча

Мастакі рэспублікі працуюць над новымі творамі да ленінскага юбілею. Вобразы правадыра і яго паплечнікаў, разнастайныя кампазіцыі на тэмы з жыцця савецкай краіны ў розных гістарычных перыядах раскажуць пра гераічны шлях, пройдзены савецкімі людзьмі пад сцягамі сацыялізма — пра мірную працу і ратныя подзвігі.

Нядаўна Міністэрства культуры СССР заключыла шэраг дагавораў з групай мастакоў нашай рэспублікі на стварэнне твораў да слаўнай гадавіны.

Пра гераічную барацьбу беларускага народа ў гады міру і Вялікай Айчыннай вайны раскажуць у сваіх творах мастакі М. Данцыг (карціна «Партызанскі край»), В. Карманаў («Брэст. 1941 год»), Л. Гумілеўскі (скульптурная група «Партызанская сям'я»), Н. Воранаў (карціна аб Савецкай Арміі), П. Крахалёў (карціна «Рудабельская рэспубліка»).

Сённяшняму дню рэспублікі прысвячаюць свае работы В. Цвірко (серыя пейзажаў «Пераўтвораная Беларусь»), В. Сумараў (карціна «Стары дом»), В. Ткачук (серыя лінагравюр «Будаўніцтва Лукомльскай ДРЭС»), Г. Паплаўскі (серыя эстампаў «Рабочыя Бабруйскага цыннага завода»), Л. Лейтман (акварэлі «Сучасны мінскі матыў»).

Скульптурны партрэт Ільіча з металу рыхтуе да юбілею правадыра скульптар А. Засіцкі.

СА ШКЛА, ЖАЛЕЗА І ДРЭВА

У майстэрні маладых мастакоў А. Зайцава і Б. Казакова ўздоўж сцяны — вялікі чарцёж. Тонкія вертыкальныя лініі робяць яго падобным на незвычайны графік. Але гэта не графік, а макет пано ў натуральную велічыню, якое мастакі робяць для новага кафэ «Мядок». Пано будзе набрана з тонкіх шкляных палачак прыгожага залацістага адцення. Пры адпаведнай падсветцы яно заззяе, заіскрыцца цёплым, сапраўды мядовым тонам.

Маладыя мастакі распрацоўваюць эскізы і другой цікавай работы — дэкаратыўнага аздаблення кафэ, якое будзе адкрыта ў прыгожым старым доме на рагу вуліцы Кірава і Валадарскага. У гэтага кафэ пакуль што няма нават назвы. А. Зайцаў і Б. Казакоў мяркуюць выразіць яго ў выглядзе старадаўняй беларускай карчмы, скарыстаўшы традыцыйныя беларускія дэкаратыўныя матэрыялы — дрэва, кераміку, каванае жалеза, а таксама рэчы старажытнага сялянскага побыту.

СПРАВАЗДАЧА ГРАФІКА

Вялікую цікавасць у гамяльчан выклікала выстаўка твораў старэйшага беларускага графіка А. Тычыны. Экспазіцыя твораў, выкананых у разнастайнай тэхніцы — лінагравюры, акварэлі, гуашы, тэмперы, — расказвае аб шматгранным жыцці рэспублікі, у тым ліку і Гомельшчыны.

Стваральнай працы савецкага чалавека прысвечаны работы «У порце Гомель», «У затоцы», «Начная змена», «Пагрузка лесу», «На Днепрабугскім канале» і іншыя.

Шэраг лістоў прысвечаны Мінску. Экспануюцца таксама пейзажы Крыма, Прыбалтыкі, ілюстрацыі да кнігі «Белавежская пуща», экслібрысы.

А. ШНЫПАРКОЎ.

АНТАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАГА ЭКСЛІБРЫСА

50-годдзю БССР і КПБ прысвяцілі кнігалюбы Баранавіч першы выпуск серыі «Экслібрысы беларускіх мастакоў». Выпуск склалі работы мастака Валянціна Ціхановіча. У прыгожай папцы-альбоме сабраны дзесяць лепшых кніжных знакаў мастака, зробленых для беларускіх дзеячоў культуры і літаратараў.

За першым выпускам выйшла ў свет падборка работ старэйшага мастака Беларусі Я. Красоўскага. На чарзе выданне экслібрысаў А. Тычыны, А. Кашкурэвіча, Я. Ціхановіча, М. Шостака.

Своеасаблівая анталогія беларускага экслібрыса, выданне якой наладзілі энтузіясты баранавіцкага «Клуба кнігі», ставіць сваёй задачай сабраць і абагульніць усё тое лепшае, што створана беларускімі майстрамі малой графікі.

В. ПАЛІКАРПАЎ.

КОНКУРС БУДУЧЫХ МАЙСТРОЎ

«Табе, правадыр!» — пад такім дэвізам у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце аб'яўлены юбілейны ленінскі конкурс-агляд тэаратычных і творчых работ студэнтаў па жывапісе, графіцы, скульптуры, прыкладным мастацтве.

Кафедры марксізма-ленінізма і жывапісу распрацавалі план конкурсу, які ахопіць больш за 150 тэм — усе этапы жыцця і рэвалюцыйнай дзейнасці правадыра.

Конкурс працягнецца да красавіка 1970 года. Пераможцы будуць узнагароджаны пуцёўкамі для паездкі па ленінскіх мясцінах (Масква, Ленінград, Ульянаўск, Шушанскае), для падарожжаў па Беларусі, а таксама памятнымі падарункамі і ганаровымі граматамі.

ПРА ЗЕМЛЯКОЎ...

У Слоніме ў адным з клубаў горада адкрылася выстаўка твораў скульптара Івана Міско. На адрыццё выстаўкі прыйшлі рабочыя, інтэлігенцыя, вучні. Прыйшлі і хлебаробы з вёскі Чамяры, у якой нарадзіўся і вырас мастак.

На выстаўцы прадстаўлена некалькі дзесяткаў скульптурных і графічных работ. Наведвальнікі пазнаёміліся з творамі, героі якіх — рабочыя, пісьменнікі, кампазітары, журналісты, вучоныя, грамадскія дзеячы Беларусі.

Асобны раздзел выстаўкі прысвечаны партрэтам землякоў, мастака. Сярод іх акадэмік Андрэй Пракапчук, журналіст Якуб Міско, паэт Валянцін Таўзай і іншыя.

А. ІВЕРС.

І. Д. ГУРСКІ — ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за заслугі ў развіцці беларускай літаратуры пісьменніку Гурскаму Ілью Данілавічу прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры Беларускай ССР.

ПРЫХОДЗЬЦЕ Ў «СВІЦЯЗЬ»

Калі вы ўваходзіце ў новы мінскі рэстаран «Свіцязь», адразу вас уражвае вялікае мазаічнае пано, вытрыманае ў спакойных блакітна-шэрых тонах, быццам гэта люстэрка славутага беларускага возера. Ахоўвае яго казачны вадзяны, магутныя елкі глядзяцца ў люстра вады.

Мазаічнае пано задае тон, падрыхтоўвае да сустрэчы са Свіцязянкай, гераіняй балады А. Міцкевіча. Матывы балады скарысталі мастакі В. Новак і Я. Шыбнёў, якія распрацавалі дэкаратыўнае ўпрыгожанне рэстарана.

У стылі вытрыманы мэбля, кераміч ны і шкляны посуд.

На здымку, які зрабіў У. Кітас, інтэр'ер залы і скульптурнае пано «Свіцязянка».

В. КРАЎЧАНКА.

СВЯТА СВАБОДНАЙ ПРАЦЫ

НА ЮБІЛЕЙНЫМ КАМУНІСТЫЧНЫМ СУБОТНІКУ

Вялікае пачынаецца з малога. 12 красавіка 1919 года камуністы дэпо Масква-Сартавальная, адпрацаваўшы змену, не пакінулі месца работы. «З прычыны таго, што прадукцыйнасць чыгуначнага транспарту знізілася», яны вырашылі працаваць у пазаўрочны час. З 8 гадзін вечара да 6 гадзін раніцы, пры святле факелаў, яны адрамантавалі тры паравозы.

Іх было пятнаццаць чалавек. Ніхто з іх не залічваў сябе ў героі. Усё было проста і будзённа. Напярэдадні яны сабраліся на партыйны сход. На парадку дня сходу было адно пытанне: як дапамагчы краіне, рэвалюцыі, што канкрэтна могуць зрабіць яны, транспартнікі? Адказ знайшоўся хутка: адрамантаваць для фронту некалькі паравозаў. І камуністы стрымалі слова: да раніцы тры паравозы былі гатовы выправіцца ў дарогу.

Тры паравозы... Нават і па тым цяжкім часе гэта было не так ужо і шмат, хоць, канечне, гэтыя паравозы былі вельмі патрэбны. Галоўнае было ў іншым. Галоўнае было ў сутнасці гэтай падзеі. Без падказкі «зверху», без усялякага прымусу, без думкі аб уласнай выгодзе рабочыя-чыгуначнікі памаглі краіне. Хоць крыху, а памаглі. Галоўнае было вось у чым: каб тыя тры паравозы маглі пайсці на фронт, павезці хлеб ці вугаль, свядомасць чалавека павінна была перамагчы, адолець велізарны цяжар мінулага, павінна была адкінуць напластаванні гадоў.

Менавіта таму тое, што зрабілі рабочыя дэпо Масква-Сартавальная, Уладзімір Ільіч Ленін назваў вялікім пачынам. Правадыр і настаўнік працоўных убачыў у ініцыятыве чыгуначнікаў «пачатак пераваротy, больш цяжкага, больш істотнага, больш карэннага, больш рашаючага, чым звяржэнне буржуазіі, бо гэта — перамога над уласнай коснасцю, разбэшчанасцю, дробнабуржуазным эгаізмам, над гэтымі прывычкамі, якія пракляты капіталізм пакінуў у спадчыну рабочаму і селяніну».

Ініцыятыва рабочых дэпо Масква-Сартавальная паклала пачатак масавым камуністычным суботнікам (12 красавіка 1919 года прыпала якраз на суботу, на «благавешчанне»), пачатак сацыялістычнаму спаборніцтву. Праз год, у красавіку 1920 года, IX з'езд партыі, якім кіраваў У. І. Ленін, адзначыў, што працоўнае спаборніцтва — магутнейшы сродак уздыму прадукцыйнасці працы, што неабходна ўцягваць шырокія масы працоўных у стваральнае творчае будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.

Іскры вялікага пачыну запалілі полымя ўсенароднага сацыялістычнага спаборніцтва, эстафета якога ідзе па краіне, пераходзіць ад пакалення да пакалення — ад ударнікаў першых савецкіх будоўляў да стаханаўцаў трыццатых гадоў, да герояў працоўных подзвігаў у гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага будаўніцтва, да пачынальнікаў руху за камуністычную працу, у якім удзельнічаюць сёння мільёны і мільёны савецкіх людзей.

У мінулую суботу споўнілася 50 гадоў з таго дня, калі рабочыя дэпо Масква-Сартавальная адрамантавалі тры паравозы для адпраўкі воінскіх эшалонаў на Усходні фронт. Працоўныя краіны вырашылі аб'явіць дзень 12 красавіка 1969 года днём Усесаюзнага юбілейнага камуністычнага суботніка і зрабіць усё для таго, каб ён стаў важнай вехай на шляху далейшага развіцця масавага сацыялістычнага стаборніцтва за ўздым прадукцыйнасці працы, за эфектыўнасць грамадскай вытворчасці, за павышэнне працоўнай актыўнасці, наватарскі, творчы падыход да справы, за датэрміновае выкананне заданняў пяцігодкі.

І вось яна прайшла па краіне, юбілейная чырвоная субота, прайшла як усенароднае свята працы. Краіна апранула рабочую спяцоўку, але выглядала святочна. Мільёны і мільёны савецкіх людзей стелі ў гэты дзень за станкі і машыны, занялі свае рабочае месца на будоўлях, выйшлі на вуліцы і плошчы, каб прадэманстраваць вернасць гераічным традыцыям бацькоў, ідэям рэвалюцыйнага пераўтварэння свету, справе вялікага Леніна.

...Масква-Сартавальная. Славутае, цяпер ардэнаноснае дэпо. Радзіма першага камуністычнага суботніка. Дзень 12 красавіка 1969 года тут пачаўся з мітынга. Трыбунай для прамоўцаў стаў гістарычны паравоз ОВ—7024, адрамантаваны паўстагоддзя назад. Пасля мітынгу — работа. На юбілейнай працоўнай вахце — ветэраны і моладзь. Сярод іх — госці: абаронцы далёкаўсходніх рубяжоў Радзімы Герої Савецкага Саюза капітан В. Бубенін і старшы сяржант Ю. Бабанскі. Сёння яны, аднак, не госці. На Ю. Бабанскім — рабочая спяцоўка. Ён падымаецца на цеплавоз. Рамонтная справа — не новая для яго: сённяшні сяржант — былы слесар. Адрамантаваныя на суботніку цеплавозы і электравозы павядуць эстафетныя цягнікі, адзін з якіх пойдзе на радзіму У. І. Леніна — ва Ульянаўск.

...Масква. Крэмль. Праз Спаскія, Баравіцкія і Троіцкія вароты суботняй раніцай сюды прыйшлі сотні людзей — супрацоўнікі Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Савета Міністраў СССР, музеяў і іншых устаноў, якія размешчаны ў Крамлі. Яны прыйшлі на крамлёўскі суботнік. Перад пачаткам работы па ўборцы тэрыторыі Крамля ўсе сабраліся ля помніка У. І. Леніну, на гістарычным месцы. Менавіта тут 1 мая 1920 года Уладзімір Ільіч прымаў удзел ва Усерасійскім камуністычным суботніку...

На юбілейны камуністычны суботнік выйшла ўся наша неабсяжная краіна ад краю і да краю — ад Ціхага акіяна да Балтыкі.

На юбілейны камуністычны суботнік дружна выйшлі і працоўныя нашай рэспублікі.

15 звышпланавых машын сыйшло 12 красавіка з канвеера Мінскага ордэна Леніна трактарнага завода. Калектыў будтрэста № 5 выканаў такі аб'ём работ, за які ў звычайны час была б налічана зарплата звыш дзвюх тысяч рублёў. Гераічнаму В'етнаму адправілі звышпланавыя плоска-шліфавальныя і ўніверсальныя заточныя станкі віцебскія станкабудаўнікі. Па паўтары-дзве нормы выконвалі 12 красавіка будаўнікі Гродзенскага капралактамавага. Закончылі падкормку азімых, пачалі падрыхтоўку глебы пад яравыя культуры, першыя вясновыя барозны праклалі хлебаробы калгаса «Зара» Лідскага раёна...

Кароткія, нібы баявыя, звесткі. Кожнае з іх — сведчанне вялікага працоўнага ўздыму і натхнення, з якімі выйшлі не субо нік працоўныя Беларусі, сведчанне рашучасці нашага народа мацнеяць магутнасць сацыялістычнай радзімы, працаваць дзеля яе далейшага росквіту.

Усесаюзны юбілейны суботнік стаў сапраўдным святам, дастойным усенародным падарункам 99-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, важнай падзеяй у падрыхтоўцы да 100-гадовага ленінскага юбілею. Юбілейны камуністычны суботнік застанецца ў гісторыі нашай краіны як прыклад працоўнай доблесці народа ў імя перамогі камунізма.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Беларускі тэатр оперы і балета паказаў прам'еру «Травіята» Д. Верді. Дырыжор — заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР і ТАССР К. Ціханаў, рэжысёр-пастаноўшчык — народны артыст УССР і БССР, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР і Грузінскай ССР Д. Смоліч, рэжысёр — Б. Заўгародні, мастак — А. Краўчук, хормайстар — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР А. Кагадзееў.

У спектаклі прынялі ўдзел заслужаныя артысты БССР Л. Златава, В. Кірычэнка, А. Саўчанка, Р. Асіпенка, артысты М. Дружына, Ул. Генералаў, В. Брун, Д. Марозаў, Л. Шаўчэнка.

На здымку: Віялета — Л. Златава, Альфрэд — В. Кірычэнка.

Фота Ул. КРУКА.

ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ КУЛЬТУРЫ — НАШ ГОНАР

У Брэсце адбылася другая абласная канферэнцыя Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. З дакладам выступіў начальнік абласнога ўпраўлення культуры М. Шаўчук.

Ва ўсіх гарадах і раёнах вобласці створаны гарадскія і раённыя аддзяленні таварыства. 310 прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў Брэстчыны — яго калектыўныя члены.

Добра працуюць пярвічныя арганізацыі таварыства ў Брэсце, у Баранавіцкім, Камянецкім, Ляхавіцкім і Столінскім раёнах. Члены Маларыцкага раённага таварыства (старшыня В. Маркаў) узялі на ўлік 52 помнікі, арганізавалі за імі догляд, стварылі карту і фотаальбом помнікаў раёна. Цікава прайшлі тут тыдзень памяці герояў і паход «Ад помніка да помніка».

Вялікі энтузіяст краязнаўства, дырэктар мясцовай школы К. Грабайла ўзначальвае Паўлопальскую пярвічную арганізацыю таварыства. Члены гэтай арганізацыі — калгаснікі і настаўнікі — стварылі музей, у якім сабраны каштоўныя дакументы аб Навасёлкаўскім паўстанні і іншыя матэрыялы.

Добра працуюць юнацкія секцыі Пружанскага раённага аддзялення таварыства. Следапыты сярэдняй школы № 1 Пружан устанавілі імёны 115 воінаў, якія пахаваны ў брацкіх магілах, і паведамілі аб гэтым родным і блізкім загінуўшых. На аснове сабраных матэрыялаў у раёне створана шэсць музеяў і 48 куткоў баявой славы.

На тэрыторыі вобласці ёсць нямала архітэктурных помнікаў, якія раскрываюць багацце духоўнай культуры беларускага народа. Члены таварыства многае робяць, каб захаваць і зберагчы іх.

Прапанавана арганізаваць падрыхтоўку пазаштатных экскурсаводаў ва ўсіх населеных пунктах, дзе ёсць помнікі.

М. ЯРМАШЭВІЧ.

■

96 дэлегатаў Гомельскай абласной канферэнцыі Таварыства па ахове помнікаў гісторыі і культуры сабраліся ў Палацы піянераў, будынак якога — выдатны архітэктурны помнік. Тут былі размешчаны фотавыстаўка помнікаў Гомельшчыны. А іх у вобласці налічваецца больш за тысячу.

Абласны савет таварыства выдаў плакаты «Помнікі Гомельшчыны» і «Дарогамі бацькоў-герояў». Арганізавана прайшоў месячнік аховы і вывучэння помнікаў, які дапамог адшукаць да тысячы невядомых імён герояў, што пахаваны ў брацкіх магілах. Часцей цяпер наладжваюцца паходы моладзі па месцах баявых подзвігаў воінаў і партызан часоў Вялікай Айчыннай вайны.

У раёнах вобласці працуюць ужо звыш 700 арганізацый таварыства. Яны аб'ядноўваюць 61 тысячу членаў.

Пра ўсё гэта гаварыў на канферэнцыі намеснік старшыні абласнога таварыства П. Анісімаў. У спрачках дэлегаты дзяліліся вопытам работы, узнімалі важныя пытанні, вырашэнне якіх паспрыяе актывізацыі работы ўсіх пярвічных арганізацый і членаў таварыства.

М. ГАТОЎКІН.

СПАБОРНІЧАЮЦЬ АРКЕСТРЫ

Днямі ў Жлобіне адбыўся раённы агляд духавых аркестраў, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. На сцэне раённага Дома культуры выступалі і ветэраны і зусім яшчэ маладыя калектывы. Падобнае творчае спаборніцтва самадзейных духавых аркестраў на Гомельшчыне праводзілася ўпершыню.

Спачатку выступалі аркестры, якія створаны нядаўна. Першае «слова» было прадстаўлена духавому аркестру Жлобінскай школы-інтэрната (кіраўнік А. Навуменка). Юныя музыканты выканалі беларускі народны танец «Бульба», «Патрыятычную песню» Глінкі і іншыя творы. Няхай не ўсё яны іграл аднолькава зладжана, але той факт, што аркестр падрыхтаваў канцэртную праграму, заслугоўвае пільнай увагі. Ну, а майстэрства, яно прыйдзе з часам, музыканты маладыя...

Парадаваў аркестр Кароткавіцкага сельскага клуба, якім кіруе К. Браслаўскі. Музыканты іграл творы Салаўёва-Сядога, Семянякі і іншых кампазітараў. І гэты калектыў малады, стаіць на пачатку творчай дарогі.

Удала выступілі калектывы Жлобінскай аўтакалоны і мэблевай фабрыкі (кіраўнікі Н. Бабіч і Б. Гарэлік). У іх рэпертуары былі творы Глінкі, Брамса і Штрауса. Журы агляду ўзнагародзіла іх дыпломамі другой ступені.

Духавы аркестр Жлобінскага раённага Дома культуры (дырыжор Ул. Браслаўскі) паказаў сябе найбольш падрыхтаваным калектывам. Ен выконваў творы савецкіх кампазітараў. Акрамя таго, у суправаджэнні аркестра саліст Л. Лосеў праспяваў некалькі песень. Аркестр узнагароджаны дыпломам першай ступені.

В. РАДЗЬКІН,
старшы метадыст Гомельскага абласнога Дома народнай творчасці.

ГОРА АД СЛАВЫ

„...У ФІНАЛЬНАЙ частцы твора выразна быў перададзены кантраст паміж моцным нарастаннем гучнасці на фоне змрочных дысанантных акордаў аргана і нечакана празрыстым і моцным піяно...»

З незвычайнай пачцівасцю я чытаю заўсёды музычныя рэцэнзіі і, можа крыху наіўна, захапляюся ўменнем іх аўтараў вылузваць кожную ноту, дзіўлюся дакладнасці, з якой яны даводзяць, што хацеў сказаць кампазітар, хоць і жыў ён, можа, дзвесце гадоў назад...

Нядаўна я пазнаёміўся з музычным калектывам, пра які мне адразу захацела напісаць. Але спачатку не мог адважыцца — успомніў, як адзін тамашні начальнік сурова спытаў, ці ёсць у мяне музычная адукацыя, ці здольны я адрозніць «сі» ад «сі-бемоль»? А я ж, далібог, не адрозню...

Таму хачу папярэдзіць: гэта ніякая не рэцэнзія, а толькі занатаваныя на паперы ўражанні, думкі чалавека, які проста любіць музыку.

Паўтара дзесятка гадоў назад па радыё даволі часта гучаў голас Жэні Таланава, саліста свешнікаўскага хору хлопчыкаў. Прыгадваеце яго каронную песню: «Родина слы-ышит, Родина знает...»? Колькі сплыло гадоў, а я памятаю чысты голас хлопчыка да самых дробных нюансаў. А вось галасы і манера выканання многіх прафесіянальных спевакоў, што прамільгнулі на нашым небасхіле за гэты час, начыста забыліся. Мо таму, што дзецям не трэба імітаваць захапленне, шчырасць і непасрэднасць — альфу і амегу кожнага сапраўды мастацкага выканання — для іх гэта натуральны стан?

Пра ўсё гэта думаю, седзячы на рэпетыцыі Смаргонскага хору хлопчыкаў. Хор гэты не такі славуты, як, скажам, свешнікаўскі, але хапае і ў яго розных грамат. Ен двойчы лаўрэат рэспубліканскіх фестываляў школьнай самадзейнасці, атрымліваў дыпломы першай ступені на розных абласных аглядах, вельмі цёпла быў прыняты ў час гастроляў у Польскай Народнай Рэспубліцы.

— Хлопчыкі, хлопчыкі, селі, селі, расправілі плечы, паклалі рукі на калені... — Яўгенія Майсеёўна Вільхоўская яшчэ раз акідае позіркам сваіх выхаванцаў.—Пеця, Вова, Юра, што там у вас (Пеця хваліцца суседзям новым сцізорыкам)? Супакоіліся? Пачнём распеўку. Паслухайце: мі-іі-ё-мі-іі-я-а. Так, узялі добрае дыханне... Трычатыры... Мі-іі-ё-мі-іі-я-а. Сачыце за пазіцыяй рота. Гук павінен быць округлы, прыгожы. Так, так, першыя дысканты: мі-іі-ё-мі-іі-я-а... Другія дысканты: мі-іі-ё... Трэція... Так, так, добра. Распеліся? Зараз паўторым «Ой, по-над Волгой». Спачатку першыя дысканты: «Ой, по-над Волгой леса зеленеют...» Тры-чатыры... Так, так, цягніце гук! Помніце, вы пра Волгу, пра вялікую рускую раку спяваеце. Песня павінна нараджацца недзе далёка-далёка, потым нарастаць, нарастаць, і вось яна ўжо гучыць горда, магутна, як гімн! Вось так, вось так: «Песня лети, пусть ее слышат все на Руси». Стоп, стоп, хлопчыкі, гэта ўжо не спяванне, а крык. І чаму так дрэнна вымаўляеце словы? І крэшчэнда нікуды не вартае. Яшчэ разок: «Дуй, ветерок...» О, гэта ўжо лепш, гэта ўжо музыка...

Я гляджу на свайго суседа па парце — Пецю і, далібог, не пазнаю яго. Мабыць, толькі дзіцячыя твары могуць так імгненна мяняцца. Толькі што каля мяне сядзела звычайнае, не вельмі прыгожае хлапчанё з канапацінкамі на круглым твары і зялёнымі невыразнымі вачыма. Зараз гэты Пеця пасталеў. Рэдзенькія бялавыя брывочкі сышліся разам, вочы пацямнелі, і ва ўсім твары такая засяроджанасць, такая сур'ёзнасць, што я толькі дзіву даюся.

Вось хор заспяваў другую песню — беларускую:

Між алешын, кустоў,
Дзе пяе салавей,
І звініць, і гучыць
Срэбразвонны ручэй...

Апошнія радкі Пеця пяе падаўшыся наперад і заплюшчыўшы вочы. Ледзь-ледзь ківае ён у такт галавой. Нібы навочна ўбачыў гэты ручэй, пачуў, як цурчаць, пераліваюцца струмені па каменьчыках...

І я думаю пра вялікую цудадзейную сілу мастацтва, пра яго дзіўную ўладу над чалавекам, якога б веку ён ні быў. І яшчэ думаю пра тое, што хлапчанё ніколі не забудзе гэтыя шчаслівыя мінуты зліцця з песняй. І ў тым добрым, што суджана зрабіць яму на сваім вяку, нейкім чынам будзе «вінавата» і песня, бо яна нараджае ў чалавеку высокія думкі і пачуцці.

І яшчэ гэтыя хлопчыкі калі-небудзь успомняць чалавека, які навучыў іх любіць мастацтва — Яўгенію Майсееўну Вільхоўскую. Вось яна стаіць перад імі. Высокая, смуглявая жанчына ў строгай чорнай сукенцы (потым выпадкова даведаўся — жалобнай — за некалькі дзён да майго прыезду яна пахавала дарагога і блізкага чалавека і вось знайшла ў сабе сілы сабрацца дзяцей на рэпетыцыю).

У адной газетнай нататцы прысвечанай Смаргонскаму хору хлопчыкаў, пра Яўгенію Майсееўну было напісана, што яна «музыкант па прафесіі і педагог па прызванні». Трошкі казённая характарыстыка, ды і не зусім правільная. Яна і музыкант па прызванні. Гэта якраз той выпадак, калі музыка — любоў на ўсё жыццё. Любоў гарачая і верная.

Жэня спявала, колькі памятае сябе. Дома, на школьных канцэртах. І неяк само сабой усім было ясна, што яна пойдзе па «музычнай частцы». Перашкодзіла вайна. У цяжкім сорак другім семнаццацігадовая дзяўчына пайшла добраахвотніцай на фронт. Была сувязісткай. А ў кароткія гадзіны зацішша — спявала. Для сябе, для таварышаў. Аднойчы—гэта было ў сорак трэцім — у франтавую часць, дзе служыла Жэня, прыехала канцэртная брыгада. Выпадкова артысты пачулі, як спявае гэтая тоненькая чарнавокая дзяўчына ў салдацкай гімнасцёрцы. І — так часта бывае ў кіно і вельмі рэдка ў жыцці — забралі яе ў франтавы ансамбль, з якім Жэня праездзіла па ваенных дарогах больш двух гадоў.

Пасля вайны яна вярнулася ў родны Гомель, закончыла музычнае вучылішча па класе вакалу. Потым тры гады кансерваторыі... Далей вучыцца не выпала па сямейных абставінах, і Яўгенія Майсееўна пайшла працаваць у школу выкладчыцай спеваў. І вось ужо дзесяць гадоў яна далучае дзяцей да высокага свету мастацтва.

Тры гады назад яна з мужам прыехала ў Смаргонь. Так атрымалася, што ні ў адной з трох смаргонскіх школ не аказалася спачатку свабодных гадзін для выкладчыцы спеваў. Яўгенія Майсееўна аднойчы зайшла ў Дом піянераў і прапанавала арганізаваць хор хлопчыкеў. Так, на грамадскіх пачатках. На грамадскіх — гэта калі ласка, гэта ў нас любяць... «Арганізуйце»—дазволілі ў Дома піянераў. І ў райана ніхто не быў супраць. Неўзабаве высокая постаць Вільхоўскай замаячыла то ў адной, то ў другой школе. Яна выбірала хлопчыкаў для будучага хору. Выбірала строга, прыдзірліва.

Як кажуць, хутка казка кажацца, ды не хутка справа робіцца. Смаргонь гарадок невялікі і падабраць па-сапраўднаму здольных хлопчыкаў не так проста. А было і такое—у хлапчанятці і слых тонкі, і галасок прыемны, і займацца хоча, а... а бацькі катэгарычна супраць. Бо не для ўсіх мастацтва — гэта ах, ах. Для каго яно пусты гук, так, глупства адно. У такіх выпадках Яўгенія Майсееўна ператваралася ў дыпламата. Расказвала, упрошвала, абяцала, ледзь не давала падпіску, што хор не пашкодзіць вучобе ў школе.

І вось першыя рэпетыцыі. А неўзабаве першыя выступленні ў раёне, вобласці, сталіцы. Станоўчыя водгукі спецыялістаў...

Я ўпершыню пачуў Смаргонскі хор хлопчыкаў летась у час Дзён Гродзенскай вобласці ў Мінску. Я наогул вельмі люблю гэтае вакальнае «фарміраванне» (хай даруюць мне спецыялісты за такое недакладнае вызначэнне), мабыць, адно з самых старажытных. Для хораў хлопчыкаў пісалі славутыя кампазітары, ды і тое, што выконвае такі хор з «дарослага» рэпертуару, набывае незвычайную прыгажосць і нейкі асаблівы сэнс.

Спяванне смаргонскіх хлопчыкаў было, як мне здаецца, на грані сапраўднага мастацтва. Таго мастацтва, якое ўзрушвае да глыбіні душы, якое доўга, доўга не забываецца.

Сёння ў рэпертуары Смаргонскага хору хлопчыкаў больш дзесятка твораў савецкіх кампазітараў, народных песень.

Расказ пра гэты творчы калектыў можна было б, як кажуць, закругліць. Але трошкі пачакаем ставіць апошнюю кропку.

Пасля рэпетыцыі мы доўга гутарылі з Яўгеніяй Майсееўнай і, калі я пачаў цікавіцца планамі хору на будучае, раптам пачуў, што хору нядоўга засталося існаваць.

— Нічога не разумею, — толькі і змог вымавіць я.

— Ды ўсё вельмі проста, распадаецца калектыў, дый годзе..

І я пачуў гісторыю вельмі і вельмі павучальную.

Як ні дзіўна, але ўсё ішло добра, пакуль хор не заяўляў вядомасць у рэспубліцы. Дзеці проста спявалі. Ім палюбіўся невядомы раней казачны свет мастацтва, і яны жылі гэтымі новымі пачуццямі і ўражаннямі.

Потым дзятву пачалі вазіць на выступленні то ў Гродна, то ў Мінск.

На першую «гастроль» ехалі з вялікай радасцю. Дадому ж вярталіся сумныя і панурыя.

— Я суцяшала дзяцей, як магла, — расказвае Яўгенія Майсееўна. — Разумееце, дзеці, ёсць дзеці, многае ім незразумела. Напрыклад, нервовая абстаноўка на аглядах, на зборных канцэртах мастацкай самадзейнасці. Тут і дарослы без звычкі адчувае сябе ніякавата, а дзеці? Як гэта часта бывае, да самага апошняга моманту ўсё ўдакладняецца парадак нумароў і ніхто не ведае, калі, нарэшце, твой выхад. Дзеці мае раскісаюць, стамляюцца, не знаходзяць сабе месца. А тут розныя цёткі і дзядзькі пакрыкваюць — тут не стой, там не сядай. Ведаеце, у дзяцей вельмі абвостранае пачуццё крыўды...

У Мінску, расказала Я. Вільхоўская, у час аднаго з рэспубліканскіх аглядаў, дзяцей ледзь не на тыдзень закрылі ў інтэрнаце. Гэта была першая паездка ў сталіцу, дзе многія хлопчыкі дагэтуль ніколі не былі і марылі паглядзець горад, пабываць у музеях, цырку. Нікому з арганізатараў агляду не прыйшло ў галаву павезці дзяцей на экскурсію. Не, яны круцілі сваю машыну, праводзілі запланаванае мерапрыемства. Дзеці ж, хоць і добра выступілі на аглядзе, дадому вярталіся зусім расчараваныя.

А потым пайшло і пайшло. То выступленне ў Мінску, то ў Гродна. То на з'ездзе настаўнікаў, то на днях вобласці, то на чыімсьці юбілеі. Аднойчы тэлеграма аб тэрміновым выездзе ў Гродна прыбыла ў нядзелю і хлопчыкаў літаральна лавілі на вуліцах, на дварах і ледзь не сілай запіхвалі ў аўтобус. Некаторыя нават не паспелі папярэдзіць бацькоў, і тыя потым шукалі дзяцей па ўсім горадзе.

Мо каму ўсё гэта здасца дробязным. Маўляў, арганізацыйныя агрэхі, дзе іх няма і ці варта з усяго гэтага рабіць трагедыю? Трагедыя не трагедыя, але ўсё гэта больш сур'ёзна, чым здаецца на першы погляд.

Зараз шмат гавораць пра эстэтычнае выхаванне моладзі. Нам хочацца, каб нашы дзеці тонка разумелі прыгожае, бо гэта робіць чалавека добрым, мудрым, шчырым і г. д. і да т. п. Але даводзіцца здзіўляцца, як, бывае, самая чыстая, светлая справа па чыёйсьці волі ператвараецца ў сваю процілегласць.

Раскажу адзін выпадак. Некалькі гадоў назад мне давялося пабыць на адным раённым аглядзе школьнай мастацкай самадзейнасці. Я стаяў за кулісамі ля групы школьніц, якія рыхтаваліся да выхаду. На сцэне танцавалі вучні іншай школы. Раптам адна з танцоўшчыц паслізнулася і ўпала. Таварышы кінуліся яе падымаць, і тут я пачуў смех. Смяяліся дзяўчаты, што стаялі побач. Яны і не хавалі сваёй радасці. Адна школьніца абхапіла сяброўку, закружыла яе: «Дзяўчаткі, цяпер першае месца за намі!»

Памятаю, я тады быў узрушаны гэтым непрыкрытым эгаізмам.

Потым дзяўчаты выскачылі на сцэну ў агнявым танцы. І хоць танцавалі яны добра, глядзець на іх не хацелася, з галавы не выходзіла сцэнка, якую я толькі што ўбачыў. І я адчуў, што асляпляльныя ўсмешкі на дзявочых тварах—завучаныя, і што ніякай таямнічасці мастацтва тут не адбываецца, бо танцуюць дзяўчаты не ад унутранай патрэбы танцаваць, а каб, кроў з носу, заваяваць першынство.

А, мабыць, пачыналася ўсё прыгожа і чыста, калі Маня з Таняй толькі запісаліся ў танцавальны гурток, запісаліся таму, што іх захапляла пластыка рухаў, музыка.

Я, вядома, не супраць спаборніцтваў, аглядаў, конкурсаў. Я за тое, каб там не псавалі, не расчароўвалі дзяцей. Мы ж забываем, што ў такім узросце пачуцці вельмі абвостраны да падману, крывадушнасці, грубасці.

У канцы мінулага года Смаргонскі хор хлопчыкаў пачалі рыхтаваць да выступлення на вельмі адказным канцэрце ў Мінску. Ледзь не кожны дзень ішлі рэпетыцыі (са сталіцы нават прыехаў спецыяльны кансультант), і дзецям настойліва ўводзілі ў вушы, што выступіць на такім канцэрце вялізны гонар, якога не кожны можа ўдастоіцца. Кульмінацыяй была прымерка гарнітуры, якія заказалі ў Мінску па эскізах лепшага сталічнага мастака-спецыяліста.

І вось надышоў доўгачаканы дзень. Дзеці, як на свята, прыехалі ў Мінск. Але перад самым выступленнем ім раптам аб'явілі, што яно адмяняецца.

— Вы не можаце ўявіць, — расказвае Вільхоўская, — што зрабілася з дзецьмі. Падняўся такі лямант, такі плач, што я спалохалася. Ледзь супакоіла. Пасля таго выпадку збіраць хор на рэпетыцыі ўсё цяжэй і цяжэй. Вось і сёння прыйшлі ў асноўным новенькія, тых жа, што паспрабавалі «славы», няма.

Вось, што мне хацелася расказаць пра Смаргонскі хор хлопчыкаў. Быць яму, ці не быць? Ва ўсякім разе залежыць гэта не ад дзяцей.

М. ЗАМСКІ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».
Смаргонь—Мінск.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

АФОРМЛЕНА ГЕОРГІЕМ ЧАРНЯЎСКІМ...

У 1933 годзе ў таварыстве «Белмастак» стаў працаваць малады выхаванец Віцебскага мастацкага тэхнікума Георгій Чарняўскі. Яго «амплуа» было дэкаратыўнае афармленне, прыкладная графіка. Творчы аўтарытэт мастак набыў досыць хутка—ужо ў 1937 годзе яму было даручана афармленне выступлення беларускай дэлегацыі на фізкультурным парадзе ў Маскве, а яшчэ праз два гады ён удзельнічаў у афармленні павільёна Беларускай ССР на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. Сярод буйных даваенных работ Г. Чарняўскага наогул шмат афармленых экспазіцый разнастайных выставак (напрыклад, выстаўкі беларускага тэатральнага мастацтва ў Вялікім тэатры ў Маскве ў часе Першай дэкады беларускага мастацтва ў сталіцы нашай Радзімы).

Шмат працуе Г. Чарняўскі ў пасляваенныя гады. Ен афармляе паркі, выстаўкі, удзельнічае ў святочным афармленні гарадскіх плошчаў, стварае афішы, плакаты, этыкеткі, разнастайныя эмблемы. Калегі па творчым цэху адзначаюць у лепшых яго работах высокі густ, культуру выканання. Узоры творчасці Г. Чарняўскага — сярод лепшых экспанатаў на выстаўках прыкладной графікі ў Беларускім аддзяленні Усесаюзнай гандлёвай палаты.

У 1949 годзе Г. Чарняўскі прымае ўдзел у афармленні горада Мінска і юбілейнага кірмашу да 30-годдзя БССР. Пасля ён удзельнічае ў распрацоўцы эскізаў афармлення беларускага павільёна на ВДНГ, а ў 1953—1954 гадах—у ажыццяўленні гэтых эскізаў.

На творчым рахунку Г. Чарняўскага такія складаныя работы, як афармленне Палаца культуры Беларускага аўтазавода ў Жодзіна, эскізы інтэр'ераў Мінскага аўтавакзала, калгаснага клуба «Піянер» у Капыльскім раёне.

Калі Мінск святкаваў дваццацігоддзе з дня вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, эскізы святочнага афармлення горада былі створаны Г. Чарняўскім.

У Г. Чарняўскага, як у мастака-афарміцеля, як у дэкаратара-прыкладніка, досыць шырокі творчы дыяпазон: ад афармлення разнастайных друкаваных выданняў да ўпакоўкі карабкоў для цукерак, ад мастацкага праектавання інтэр'ераў «Бюро бытавых паслуг» да вялікіх дэкаратыўных роспісаў, ад стварэння паштовак да арганізацыі кампазіцыйных лістоў экспазіцый і стэндаў разнастайных выставак.

Значны творчы вопыт, набыты за многія гады працы, памог яму ў апошні час выканаць такія адказныя творчыя заданні, як афармленне выстаўкі, прысвечанай маладым механізатарам, у Салігорску, разнастайныя ўпакоўкі для тавараў да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка і 900-годдзя Мінска, вялікага дэкаратыўнага роспісу «Хімія» для Лейпцыгскага кірмашу ў 1967 годзе.

Да мастака прыйшла сапраўдная творчая сталасць. Многае створана ім у імя прыгажосці, якая акружае нас ў паўсядзённым жыцці. Створана добра, на высокім прафесіянальным узроўні. І ў гэтыя дні, калі Г. Чарняўскаму спаўняецца шэсцьдзесят гадоў, калегі зычаць яму новых творчых поспехаў у цяжкай і складанай, але ж і пачэснай галіне творчасці. У той галіне творчасці, дзе адказнасць мастака асабліва высокая, бо створанае афарміцелем, дэкаратарам-прыкладніком — сярод самых шырокіх мас.

Ул. БОЙКА.

Барыс БУР'ЯН

ПРАФЕСІЯ — РЭЖЫСЁР

ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Л. ЛІТВІНАВА

СПРАВЯДЛІВА кажуць, што няма ў мастацтве нічога больш эфемернага за творчасць тэатральнага рэжысёра. Яна гарыць незгасальным полымем у часе рэпетыцый, гартуючы волю кожнага выканаўцы, а потым нібыта хаваецца ад вока гледача, перад якім жывая рэальнасць—гэта акцёры, дэкарацыі, музыка. Зробленае рэжысёрам—няўлоўнае, бо хто ж мае права сцвярджаць, быццам вось гэты трагедыйны вокліч-праклён у адрас і Мантэкі і Капулеці жыццялюба Меркуцыо ў смяротную яго хвіліну—«Чума на абодва вашы дамы!» — знойдзены быў рэжысёрам, а не нарадзіўся ў душы артыста? Але нават калі непаўторны ўсплёск голасу, які зараз абарвецца назаўсёды, і сапраўды нарадзіўся ў артыста, ведайце—да гэтага яго вёў мастацкі кіраўнік, рэжысёр. Адзінае, аб чым вы можаце гаварыць больш-менш упэўнена як пра нешта «рэжысёрскае», —мізансцэны, ды толькі ці ж па іх мы мяркуем аб гучанні сцэнічнага твора?! Таму я ўяўду вас употай у пустую залу купалаўскага тэатра—там, на сцэне, рэпетыруе Леў Літвінаў...

— Не! Нельга быць такім злавесным у такое жаданае для Тыбальта імгненне! —крычыць рэжысёр артысту.—Калі ты прадчуваеш, што зараз твая шпага праб'е сэрца чалавека, зрабіся прыгожым. Нахабна прыгожым! Як ганчак або важак воўчай зграі. Разумееш, ён квітнее, калі набліжаецца злачынства...

Тыбальт і без таго імпазантны на сцэне, але вось пачалі зноў паўтараць эпізод, і артыста цяжка пазнаць—ён літаральна прамяніўся ўсмешкай самаўпэўненага забойцы і кідаўся ў бой, нібы вясёлы Геркулес. «Правільна! — чулася з залы.—Так ён і да ўлады ў Вероне прабіецца, тыран з усмешкай на вуснах...»

Праз чатыры гады пасля гэтай рэпетыцыі, у пяцідзесятым, Леў Маркавіч запрасіў мяне на прагон «Талентаў і паклоннікаў», папярэдзіўшы, што гэта, магчыма, яго апошняя пастаноўка ў купалаўцаў. У антракце ён з нейкай падкрэсленай галантнасцю ўзяў пад руку выканаўцу ролі Сашанькі Негінай і прыцішана прамовіў:

— Я ўжо веру, што ваша Негіна актрыса, што гэта ў яе «ад бога». Дык не хавайце ад мяне, што яна — вялікая актрыса. Ну, такая, як Паліна Стрэпетава... Вялікія, яны вучаць быць гордым нават свой сум. Хай глядач пабачыць, якая гэта напружаная ўнутраная праца—вучыць сябе быць гордай нават на краі бездані...

І зноў я глядзеў на Сашаньку Негіну ў спектаклі і мяне чаравала трапяткая душа гэтай маладой жанчыны, якая крыўдзіць сама сябе, пакутуе, ідзе насустрач трагедыі, і ў яе вачах, поўных слёз, зіхаціць агеньчык гордасці, выпрацаванай для будучыні.

Не ведаю, ці помняць да дробязей П. Пекур (Меркуцыо), І. Шапіла (Тыбальт) і І. Ждановіч (Негіна), што менавіта гаварыў ім некалі Л. Літвінаў, аднак шчаслівыя азарэнні і ўнутраны творчы ўздым, калі ты адчуваеш у сабе не звычайны, а выдатны характар, і ён робіцца на час спектакля твазм,—гэта не забываецца. Ні акцёрамі, ні гледачамі. І добра, што ў тыя часы, калі на сцэне купалаўцы іграл так, як вучыў і патрабаваў гэты рэжысёр, мы забывалі аб ім, аддаючыся ўладзе тэатра. Аднойчы я сказаў пра гэта Льву Маркавічу, і ён раптам усміхнуўся і пакруціў галавой: «А я адрозніваю, калі зала апладзіруе выканаўцам, а калі — мне. Хоць і не падазрае аб тым, але ж—мне! Вось такія апладысменты мне дарагія...» І ён прыгадаў выпадак часоў грамадзянскай вайны. Было гэта ў нейкім маскоўскім тэатры — давалі спектакль для чырвонаармейцаў, якія кіраваліся на фронт. Сяляне і рабочыя ў шынелях паверылі ў праўду таго, што адбывалася на сцэне, і сачылі за падзеямі ў напружанай цішыні. Раптам праз усю залу крочыць баец. Акцёры чакалі, што зараз баец будзе страляць у тых, хто іграў зладзееў, а той спыніўся каля суфлёрскай буды, зірнуў туды, пабачыў «інтэлігента ў пенсне» і, паказаўшы яму наган, злавесна прашаптаў: «Не падказвай!»—і пайшоў на сваё месца... «Я падказваю, больш таго—гэта мой абавязак падказваць артысту, каб атрымалася адзінае па задуме і стылявым вырашэнні відовішча. Але... спыняюся ля мяжы, пасля якой, здагадваюся, глядач абурыцца мной і запатрабуе, каб я не падказваў».

Гледачы і не крычалі яму так. Затое нешта такое ён чуў ад крытыкаў. Яго вінавацілі ў тым, што ён захапляўся фармалістычнымі прыёмамі і адвольна перапрацоўваў драматургічны тэкст. Як сапраўды таленавіты чалавек, ён адстойваў свае права на самастойную трактоўку п'ес, ведаючы, што ў такой спрэчцы лепшым доказам справядлівасці можа быць толькі спектакль. У канцы 30-х гадоў ён захапіўся вучэннем К. С. Станіслаўскага, і яго пачалі вінаваціць у сляпой артадаксальнасці. А ён не ўкладваўся ў схему—не быў ні фармалістам, ні шкаляром «сістэмы». Літвінаў шукаў. Шукаў вельмі доўга. Заўсёды. Бо ведаў: мастацтва памірае, калі пошук спыняецца.

Пачаўшы свае жыццё ў тэатры яшчэ ў гімназічныя гады, Леў Літвінаў на пачатку 20-х гадоў разам з Е. Міровічам ставіць у Мінску так званыя «масавыя дзействы» пад адкрытым небам — «Праца і Капітал» і «Гапоўнаўшчына», у якіх удзельнічалі сотні аматараў і прафесіянальныя артысты. Яго пастаноўка «Авечай крыніцы» Лопэ дэ Вэга ў Дзяржаўным яўрэйскім тэатры БССР была падзеяй у сцэнічнай гісторыі гэтай драмы — яна была адзначана на Алімпіядзе мастацтва ў Маскве ў 1930 годзе, яе параўноўвалі з вядомым спектаклем К. Марджанава, падкрэсліваючы смеласць рэжысёрскага вырашэння і сапраўды тэатральную форму, дзе імклівы струмень рамантычных страсцей ззяў усімі колерамі вясёлкі. У палемічным запале малады рэжысёр імкнуўся супроцьстаяць «бытаўшчыне» — ставіў спектаклі часам з пераборам мастацкіх фарбаў, нібы выклікаючы крытычны агонь на сябе. Крытычнага агню хапала, і ён, хоць і любіў, як сам прызнаваўся, «адбрэхвацца», усё ж узважваў і цвяроза ацэньваў для сябе здабыткі і страты ў сваёй творчасці.

Аднойчы Леў Маркавіч убачыў у мяне кніжку вядомага мхатаўскага рэжысёра В. Сахноўскага «Думкі аб рэжысуры». Пагартаў. І сказаў нешта такое: маўляў, кніжная душа Васіль Рыгоравіч здабывае мёд з мёду; што ж, і гэта таксама мастацтва, але куды смачнейшы здабытак з палявых кветак. «Фармаліст»—і раптам такія словы! Але давайце ўспомнім, што гэта ж Л. Літвінаў пасля «Жакеры» Мерыме паставіў «Бацькаўшчыну» К. Чорнага, першы драматургічны вопыт буйнейшага беларускага празаіка. І тут, умоўна кажучы, мёд быў самы сапраўдны—на сцэну прарвалася супярэчлівае і трагедыйнае жыццё, на ўвесь голас загаварылі людзі глыбокіх народных характараў. Дэбютаваў тады не толькі драматург — упершыню ва ўсім бляску таленту раскрыліся І. Ждановіч і Г. Глебаў. Цяжка сказаць, што і як «падказваў» ім Л. Літвінаў, аднак вобразы, створаныя імі, сталі хрэстаматыйнымі ў гісторыі нацыянальнай сцэны. Што ж датычыць К. Чорнага, дык я чуў ад Льва Маркавіча такое прызнанне: «У нас з Мікалаем Карлавічам была напалову падрыхтаванай адна неспадзянка—ён пісаў п'есу як... раман. Аўтарскі тэкст у ім—гэта падрабязныя рэмаркі. Смерць абарвала яго цікавейшую задуму...» Можа, меўся на ўвазе «Млечны шлях», але тады пра гэты незавершаны твор я і не ведаў.

Зразумела, што такі талент, як К. Крапіва, праклаў бы сабе шлях на сцэну і без менавіта гэтага рэжысёра, і ўсё ж першым чалавекам у тэатры, які падтрымаў яго востра-канфліктную драму «Канец дружбы» ў 1934-м годзе быў Л. Літвінаў (ён і паставіў спектакль па ёй разам з маладым тады Л. Рахленкам).

Праўда жыцця, адлюстраваная ў гэтых спектаклях, была адухоўлена роздумам рэжысёра-мастака аб часе, у віры якога ён прайшоў пакручасты шлях уласнага грамадзянскага і творчага станаўлення. Драматычныя героі былі як бы прапушчаны праз прызму тэмпераменту Л. Літвінава. Дарэчы, ён вельмі часта спасылаўся на выказванне Энгельса з пісьма Ласалю, што «асоба характарызуецца не толькі тым, што яна робіць, але і тым, як яна гэта робіць». І дадаваў—у тэатры «як» вызначаецца рэжысёрам, гэта ён знаходзіць ключы да акцёрскай эмоцыі і ўстанаўлівае градус напалу.

Ён умеў гэта рабіць ювелірна. Яго ўменне тварыць несла радасць і артыстам, і нам, гледачам. Успомнім хоць бы Б. Платонава ў некаторых спектаклях,

Паэтычная паверка

Антон БЯЛЕВІЧ

ШЧОДРАСЦЬ

Як на пальчыкі-праменні стане
Раным-рана сонца на двары,—
Я пайду на першае спатканне
З першаю пралескай у бары;

З купіны, дзе кнігаўка гняздзечка
Прыхавала ў леташняй траве;
З яварам, з калінаю над рэчкай,
Што да бацькі-Нёмана плыве;

З песняю азяблай жаўруковай,
Што цурчыць над руннію маладой;
З музыкай маторнаю вясновай,
З ціхай жураўлінаю трубой.

То крывою сцежкай, то шашою
Я прайду к зялёным берагам.
Тое, што ў сябе ўбяру душою,—
У другія душы перадам.

ПРЫКМЕТА

Вербалознік размякне апоўдні,
А ўначы яго сцісне марозік.
Не ваююць яшчэ за шпакоўню
З вераб'ямі шпакі на бярозе.

Маладая яловая шышка,
грабеньчык, яшчэ не іскрыцца,
А ў двары, у прыгрэтым зацішку,
Можна з лужыны пеўню напіцца.

А ў народзе прыкмета такая:
Певень з лужыны першай
нап'ецца,—
Дык вясна з беластволага гаю
Такаваннем глушцоў адгукнецца;

Дык вясна ў баразну пагукае,
У траву, у лісты апранецца;
Белы цвет па садах загайдае,
Пасябруе з пчалой залатою...

З першым громам, вясна маладая,
З першай цёплай вішнёвай
смалою!

УДЗЯЧНАСЦЬ

Ацяліпася наша Пралеска
У старэнькім халодным хляве.
Маці ў хату цялятка прынесла.
— Хай цялушка ў цяпле пажыве...

Падстаўляю пад самую пыску
Міску крупніку цёплага ёй.
А яна капытамі ў міску,
Не па густу мой крупнік малой.

Я падношу ёй цукру драбочак:
— Ён салодкі. Чаму не ясі!
Вось дык пані! І цукру не хоча.
Моркву даў ёй:
— Бяры. Адкусі.

Не бяры, не кусае цялушка.
Мо скарынку яна пажуе!..
Разам з намі ў цяплыні жыве
Аж да раніцы ў хаце пястушка,
А Пралеска рыкае ў хляве.

Мы цялушку туды перанеслі
Праз завею ў старым шарачку.
Аблізала ёй пыску Пралеска,
Малаком напаіла дачку.

А як вырасла—у час той не блізкі
Аддавала нам добры надой.
Мо' прыгадвала крупніку міску,
Што падносіў халодная зімой!

У ЧЫСТЫМ ПОЛІ

Стаіць у чыстым полі дрэва.
Чуваць паскрыпванне сукоў.
А вецер—справа, вецер—
злева,

А вецер—з чатырох бакоў.

Куды сасне крывой падзецца!
Спякотна летам. А зімой—
У полі белым трэба грэцца
Сваёю ўласнаю смалой;

Смалу ганяе пад карою,
Ей супакою не дае.
Нібы гарачаю крывёю
Наліты поўна ствол яе,
Чырвона-медны, крамяністы,
Касцісты і шурпаты ствол...
Адна стаіць у полі чыстым.
І толькі поле навакол.

І толькі сонца, толькі зоры,
І вецер з чатырох бакоў...
А як жа ёй дайсці да бору,
Да сваякоў, да землякоў,
Да кучаравых сасякоў!

НАШ ВЯСНОВЫ ВЕРНІСАЖ

Умора ў рэспубліцы пачаўся традыцыйны вясновы Тыдзень мастацтва. «Літаратура і мастацтва» таксама ўключаецца ў выставачную кампанію тыдня. Сёння мы адкрываем наш «вясновы вернісаж». У ім прымаюць удзел восем мастакоў. Але ў ролі... герояў сяброўскіх шаржаў. Прадстаўляе сваіх калег мастак М. Лісоўскі. Як чалавек самакрытычны, ён пачынае гэтую галерэю шаржаў з самога сябе (уверсе злева).

Ул. Стэльмашонак.

В. Ціхановіч.

Ю. Пучынскі.

В. Цвірко.

Р. Кудрэвіч і А. Гугель.

М. Данцыг.

Л. Баразна.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Валянцін Мыслівец. Мае заводчыкі. Нарысы. Мастак В. Сакалоў. 1969 г. Тыраж 2.000 экз. 200 стар. Цана 26 кап.

З. Насценка. Іосіф Жыновіч. Старонкі жыцця. (Серыя «Нашы кампазітары»). Мастак В. Юрчанка. 1969 г. Тыраж 4.000 экз. 72 стар. Цана 13 кап.

І. Нісневіч. Кампазітар Нестар Сакалоўскі. (Серыя «Нашы кампазітары»). Мастак В. Юрчанка. 1969 г. Тыраж 3.800 экз. 52 стар. Цана 9 кап.

Эдуард Снобелеў. Дарога. Вершы. Першая кніга паэта. Мастак В. Жыжэнка. На рускай мове. 1969 г. Тыраж 2.000 экз. 80 стар. Цана 21 кап.

Іван Шальманаў. Дзень пачаўся. Апавяданні. Мастак М. Шырокаў. 1969 г. Тыраж 3.000 экз. 136 стар. Цана 14 кап.

І. Шарынскі. Вандраванне па Канадзе. (Успаміны аб жыцці беларусаў, якія ў розны час выехалі за акіян). Мастак Ул. Круглоў. На рускай мове. 1969 г. Тыраж 20.000 экз. 144 стар. Цана 21 кап.

НА УКРАІНСКІМ ТЭЛЕЭКРАНЕ

Стала добрай традыцыяй супрацоўніцтва Беларускага і Украінскага тэлебачання з мінскім і кіеўскім тэатрамі юнага гледача. Кіяўляне ўжо некалькі разоў прыязджалі ў нашу сталіцу для паказу па тэлебачанні сваіх лепшых спектакляў. Гасцяваў у Кіеве і мінскі тэатр.

Гэтымі днямі беларускія артысты выязджалі ў сталіцу Украіны і паказалі маленькім гледачам спектаклі «Малыш і Карлсан, які жыве на даху» і «Тры мушкецёры».

Многія рабочыя і служачыя Беларускага аўтамабільнага завода вучацца завочна ў інстытутах і тэхнікумах Беларусі. Вялікую дапамогу ў вучобе ім аказвае бібліятэка Палаца культуры аўтазавода. Кніжны фонд яе налічвае зараз каля сарака тысяч тамоў. Работнікі бібліятэкі актыўна ўключыліся ва Усесаюзны агляд бібліятэк, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

На гэтым здымку вы бачыце загадчыцу бібліятэкі Таццяну Кічараву, якая дапамагае падбіраць літаратуру токару БелАЗа, студэнту другога курса Магілёўскага педагагічнага інстытута Аляксандру Бярговіну.

Фота Ул. КРУКА.

Сярод кніг

ПА ПРАВЕ САЛДАТА І СЕЙБІТА

САМАЕ важнае і самае галоўнае, што можна сказаць пра лірычнага героя Аляксея Пысіна: ён—барацьбіт за жыццё, прыгожае ў сваіх маральных асновах, адухоўленае чыстымі помыслямі і высокімі імкненнямі,—за жыццё, вартае тых ідэалаў, у імя якіх ля Дняпра і Віслы, каля вялікіх гарадоў і «соцень палявых Баркоў», змагаліся і гінулі салдаты Вялікай Айчыннай.

Мабыць кожны, хто пачынае чытаць вершы А. Пысіна, адразу адчувае іх асаблівую душэўную танальнасць, іх высокі маральны пафас і прастату выслову:

Не трэба гучна гаварыць,
Выкатваць словы грамавыя...

Нягучныя і стрыманыя звароты паэта да загінуўшых сяброў. («Прыйшоў да вас я прывітацца і аддаю маўкліва чэсць»), да маці («У запозненым прызнанні зноў ты, маці, прада мной...») і да дачкі («Пастаім, дачка, на развітанне, сёння першая разлука ў нас...»), да продкаў і патомкаў, да землякоў...

Так, А. Пысін скупы ў жэстах і стрыманы ў словах. Але чаму гэта стрыманасць знаходзіць у нас такі водгалас, так запалоньвае нас?

Унутранае жыццё чалавека, з якім мы знаёмімся ў паэзіі А. Пысіна, дарагое і блізкае нам сваёй зрошчанасцю з усім светам чалавечага быцця. Ён воін, які застаўся назаўсёды верным франтавому пабрацімству; ён удзячны нашчадак продкаў-землякоў, ад якіх атрымаў спадчыну жыццёвай мудрасці: сын, верны матчынаму блаславенню быць добрым і душэўна чыстым; бацька, які лепшыць і беражэ сённяшні свет для дзяцей.

Вылучыць з гэтай зрошчанасці якую-небудзь адну «сілавую лінію» амаль немагчыма: усё крыжуецца і сплятаецца ў лірычным маналогу вакол галоўнай думкі, сыходзіцца ў адзінства, як карані да ствала дрэва.

Адзін з самых моцных і пастаянных матываў паэта—матыў вернасці свайму абавязку перад тымі, хто загінуў. Але калі гаварыць пра гэты матыў, давядзецца пашыраць кола гаворкі. Жальба, скруха, гаркота паэта адольваюцца ўсведамленнем нямарнасці баявых спраў таварышаў-байцоў, яго жаданнем адваяваць сяброў ад нябыту, зацвердзіць іх месца сярод жывых, уключыць іх у той жыццёвы кругазварот, дзе маюць мову «вешчыя травы і светлыя дрэвы». Таму запаветы паўшых таварышаў аб'ядноўваюцца з народнымі і матчынымі запаветамі ў адну духоўную спадчыну: у свядомасці яны побач і разам — і працаўнікі-сейбіты, і салдаты, і маці,—бо наша жыццё—вынік іх агульнай справы:

Дарагія сябры і суседзі
Ў адыходзе не год, не другі.
Рыбакі не ўзялі з сабой сеці.
Хлебаробы забылі плугі.
А салдат—без вінтоўкі, без
наскі.
Бы ўляглася вайна на вякі.
Раз у год—даўні звычай
славянскі—
Я наведваю вас, землякі.
У галовах грудок напрацяляю:
Маці, спі... Свецяць травы
твае...

Тут жа — выгокі паэтавай жыццястойкасці і мужнасці. Ён таксама мог стаць травою, ён па ўласным вопыце ведае, што «в дни войны на жизнь и смерть права у всех равны» (А. Твардоўскі), і таму смела глядзіць за мяжу нябыту: «Земляную калыску люляю і заглядваю сам у яе...».

Паўшых сяброў паэт згадвае ледзь не пры кожнай сустрэчы з прыродай. Гэта яго арганічная душэўная патрэба, форма маральнай сувязі з існым светам: «Час адлічваюць новыя дрэвы, што ў сярэдзіне веку ўзышлі. У часіну душэўнай патрэбы ўспамінаем мы тых, хто ў зямлі. Пад карэннямі, пад малачаем ёсць у кожнага хтось дарагі...»

Шырэй і шырэй разыходзяцца кругі гэтага пачуцця.

Для А. Пысіна смерць у імя жыцця—трагічная форма адстойвання і паляпшэння жыцця, узмацнення пазіцый дабраты і чалавечнасці: «Можа, заўтра будзе свет цяплейшым, дабратой прасвечаны знутры...»

У драматычных адценнях маналогу вельмі шмат скрухі не толькі ад незваротнасці тых, што «ўзышлі травой і гарыцветам», але і ад неадольнасці забыцця, што замахваецца на памяць, нішчыць сувязі двух светаў: «Сябрам-таварышам я пазваню, таварышам, што ад мяне далёка... Я неаднойчы выклік паўтарыў, а даль маўчыць, а цішыня нямее...»

Толькі ў гэтым не пагаджаецца паэт з жыццёвым кругазваротам. Затое ён вітае ўсё натуральнае, ціхае дзеянне жыцця: рост хлеба ў палях, змену траўняў і лістападаў, рух каранёў. Ён пранікаецца святочнасцю і захапленнем, прыпадаючы душою да шырокай і вольнай жыццёвай плыні:

Быццам вартаюся ў тое
былое,
У дапатопны той век:
Першае поле не ўздыбіў
раллёю,
Першае дрэва не ссек.
І пачынаць мне ўсё трэба
нанова:
Плакаць, смяяцца, любіць.
З гліны, з праменняў, з
роднага слова
Свет свой па-свойму ляпіць.

Адсюль прыходзіць да паэта і радасць кахання, адчуванне паўнаты жыцця, што дае яму высокія ўзлёты-азаранні:

Птушыныя гнёзды пад снегам
заснулі,
Дрымотную пражу завеі
прадуць.
А хочаш—зімой закукуюць
зязюлі,
Мядовыя росы на дол
упадуць...

Яго каханню патрэбны свята, гул жыцця, лес, «бярозкі з вольхаю, суніц здаровы спелы пах», і чым мацней пачуццё, тым больш знітавана яно з быццём роднай прыроды: «Ў мой лістапад няшумны дакраніся маіх павек. І я адчую, ўбачу, невідушчы, далонямі тваімі ўбачу я ў палёце ластаўку, рабіну ў пушчы, любоў мая».

З прыродай у паэта—згода, сяброўства, сваяцтва:

Я веру, быццам сваякам:
Дарозе—
цётцы гаманлівай,
Дубам—задумлівым дзядзькам,
Пчале над белаю галінай.

Прырода ўваходзіць у свет пысінскай паэзіі не ў нейкай аб'ектыўнай безадноснасці, а ў прамой сувязі з духоўным жыццём чалавека: «Можа, свет і любім мы за тое, што ў стрыечнай блізкасці жывём. Штосьці свойскае і штось людское ў гэтых дрэў, каменняў і жывёл».

Арганічная патрэба чалавека, яго першаступенны абавязак — быць чалавекам, з годнасцю несці сваю жыццёвую ношу, не шукаючы палёгкі ні ў прапісных ісцінах («Ісціне не трэба, каб сказаў ты, што не ўвесь яшчэ ў далоні свет...»), ні ў абывацельскай адасобленасці і непамятлівасці, ні ў бяздумным аптымізме, ні ў сентыментальнай плаксівасці.

І яшчэ: чалавек з годнасцю спаўняе свой пачэсны жыццёвы доўг, калі ён помніць продкаў і дбае ад патомкаў («А можа дзед, зусім спакойны, даўно ўжо блаславіў далонь, што яблыні падасць шпакоўню, здабыты паняе агонь»). Тады чалавечае жыццё—кароткі прамежак паміж мінулым і будучым—годна ажыццяўляе «часоў былых і новых сувязь», кандэнсуючы ўсё жыццёва істотнае, тады даўняе і сягоняшняе так сплятаюцца ў свядомасці з будучыняй, што ўзнікае асаблівы час—час душы, якая набыла асаблівую відушчасць, сягнуўшы да жыццёвага ўзвышэння. Тады кожны новы год, кожны дзень, кожнае імгненне — новы крок уперад, новы вырай душы, «пачатак новы». Тады па пляны любы груз, любая ноша: «Бяру з сабой нялёгкія дарогі, сляды пакут, што не датлелі там, бяру з сабой бяссонныя трывогі...» (Тут мне згадваецца Тычына: «Не питайся: що то э, що мені на гнуці плечі вантажу хтось піддаэ... **Раз життя—то все до речі...**»). Тады сама сабою высвятляецца галоўная задача чалавечага жыцця: плодная сяўба.

Жыта — вечнасць чалавека, яго бяссмерце, яго спадчына і наказ:

Якую б даль пазнаць ні
давялося,—
А ўсё ж навуку пройдзеце
адну:
З драбнютнага зярнятка—ўсе
калосці,
І толькі плуг
узніме цаліну.

Выяўленне зместу і вартасці пысінскай паэзіі—справа не аднаго артыкула, тым больш газетнага. З немалым шкадаваннем даводзіцца прапускаць многія вершы, якія жывуць у душы, не спыняцца на паэмах, якія заслугоўваюць асобнай размовы...

А. Пысін—выдатны майстар, майстэрства якога ва ўменні дакладна і поўна выявіць той адзіна верагодны і магчымы стан душы, што выклікаў перажыванне, перадаць увесь ход гэтага перажывання, не губляючы яго ні ў прыватнасцях пабочных настрояў, ні ў прахадных, выпадковых словах. Унутраная структура яго вершаў чуйна рэагуе на развіццё перажывання, на кожны паварот думкі і пачуцця.

Можна прывесці шмат яркіх прыкладаў, як дасягае А. Пысін у сваіх вершах высокага ўнутранага напружання, як дае выхад пачуццю ў нечаканых яркіх вобразах.

Вось, напрыклад, верш «Ноч, стамлёную частымі снамі...» — аб нялёгкай ношы памяці. Ён невялікі—маштаб абагульнення і інтэнсіўнасць перажывання вымагаюць формы кароткай і сціслай.

Ноч, стамлёную частымі
снамі,
Памяць, промнем сваім не
будзіі
Захынаю гарамі, лясамі,
Пакідаю яе ў забыцці...

Гэта змаганне з памяццю — не слабасць, паэту стае душэўнай сілы, каб узяць яе нялёгкі груз на сябе: «Пажадаю вам, людзі, ўсміхацца ў добрых снах...» «Пажадаю» зрошчана рыфмай з пачаткам папярэдніх радкоў («замыкаю»), гэта працяг змагання, частка аднаго моцнага пачуцця, але гэта і наступнае звяно перажывання. На «добрых снах»—націск, тут кульмінацыя страфы, і адсюль —яшчэ большае завастрэнне, канфліктнае ўзмацненне верша: «Я ад добрых адвык. Мне пажары, пажары ўсё сняцца, я баюся аслепнуць ад іх...» Пачуццё ўзрастае аж да слоў аб унутраным спапяленні:

І здзіўляцца, напэўна, не
трэба,
Калі выйду, апалены, з сну,
І, не ўбачыўшы блізкага неба,
Свет абмацваць пачну,
Як сцяну.

Гэты верш шмат гаворыць аб духоўным вопыце аўтара, аб сіле і мужнасці, аб душэўнай шчодрасці паэтавага лірычнага характару, аб напале яго пачуццяў.

У лепшых вершах А. Пысіна кожнае слова звязана з агульным зместам сваім значэннем і гукавым складам, яно займае ў радку сваё адзіна магчымае месца, яно акцэнтуецца лагічным націскам або выносіцца ў рыфму толькі ў выпадку пачуццёвай і сэнсавай неабходнасці. Паэтычны сінтаксіс паслухмяна падначальваецца інтанацыйнаму дыханню, інверсіі натуральныя і арганічныя, як само пачуццё. Яркія ўспышкі метафар узвышаюць пачуццё, узбагачаюць яго настраёвасць і змястоўнасць: «Над дахамі ў світальныя часы дымкі—як разматаныя палотны. Лятуць ад нас бацькоўскія лясы, лятуць ад нас у вырай незваротны».

Вельмі выразнае і гукавое выражэнне тэмы. «На ўзлессі свецяцца наскрозь асіны» — якая відната ў гэтым чуйна злоўленым асінавым трымценні восені (а верш — аб душэўнай яснасці, аб чысціні сумленна пражытага жыцця, аб вечнай навізне свету). І як тонка вызвоньвае цішыня летняга дня ў вершы аб радасці жыцця ў свеце роднай прыроды, аб бязмежжы гэтага свету і яго крэўнай роднасці з душэўным жыццём чалавека: «Вось бескапытная дарога звініць у бесканечнасць дня...»

Адзінства пачуцця і зместу змацоўваецца яшчэ і ўнутранымі гукавымі паўторамі, скразнымі рыфмамі. «**Забыта** многае ў жыцці, з дарогі змецена і **змыта**. Мне ў **жыта** хочацца ўвайсці, мне вечнасцю здаецца **жыта**...» —дакладнасць псіхалагічнай матывіроўкі перажывання (выхад з дробязяў будзённасці, «змыванне» неістотнага, парыванне да сутнаснага, адвечнага) падкрэсліваецца гушчынёй сугучных слоў, што сыплісся, як каласы на жытнёвай ніве.

Драматычная напростасць пачуцця выяўляецца і праз інтанацыйныя пераносы, якія выносяць пад сэнсавы і інтанацыйны націск найбольш важнае ў вершаваным перыядзе, перадаюць пачуццёвы зарад ад адной страфы да другой, і праз стыкаванне слоў, калі канец адной страфы рыфмуецца з пачаткам наступнай. Страфічная будова гарманізуецца сэнсам, жыццёвы кругабег знаходзіць у ёй «кальцавую» адпаведнасць:

І мяне бярозавай вясною
Падманіла з сцежкай карусель,
Тысяча зямель перада мною,
І за мною **тысяча зямель**.

Гаварыць аб такім майстэрстве паэта—значыць зноў і зноў высвятляць для сябе арганічнае адзінства і жыццёвую эстэтычную змястоўнасць пысінскай лірыкі. Гэта паэзія, якая не ведае аўтаматызаваных мастацкіх форм, паэзія цэльная і разнастайная ў сваім адзінстве, багатая духоўна, паэзія высокіх ідэалаў — ідэалаў, неаддзельных ад самога жыцця, стаўшых самім жыццём:

Мой спіт вышай усіх нявідач,
Вышай усіх нявідзь.
Я сам загорнуты ў кумач
Ад галавы да пят...
Ты будзеш неўміручы, спят,
Бо мы цябе нясём
Ў сваёй крыві, ў сваіх
касцях
Перадаём — з жыццём.

Варлен БЕЧЫК.

Аляксей Пысін. «Пойма». Выбранае. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1968.

пастаўленых Л. Літвінавым — пан Быкоўскі, Рамэа адважны гарэза Сярожка Цюленін у «Маладой гвардыі» і Нарокаў у «Талентах і паклонніках». Непазнавальныя пераўвасабленні! Супроцьлеглыя характары! У кожнага свая мера інтэлекту, жыццёвага вопыту, дабра і справядлівасці. І дыяпазон — ад вадэвіля да высокай трагедыі, ад рамантычнай драмы да псіхалагічнага апавядання...

— Барысу варта толькі дакладна падказаць, астатняе ён зробіць сам. Дайце яму рытмічны малюнак так, каб акцёр прыняў яго за ўласнае адкрыццё,— будзе свята высокага мастацтва,—так гаварыў Леў Маркавіч пра вялікага Платонава.

Нават у дзень яго юбілею нельга сказаць, што жыццё гэтага чалавека ў тэатры ішло роўна,—не. Літвінаў сварыўся, спрачаўся, некага здымаў з ролі, кімсьці захапляўся, і акцёры адкрыта крытыкавалі яго, пра што сведчаць і архіўныя стэнограмы пасяджэнняў трупы купалаўскага тэатра. Але было і тое, чаго не фіксіравалі стэнаграфісткі: пасля самых бурных дыспутаў да Літвінава падыходзілі артысты і прасілі абавязкова заняць іх у яго чарговай пастаноўцы. Ён цяплеў, абяцаў, займаў...

З ім было цікава працаваць, ён захапляў і няўрымслівым тэмпераментам, і эрудыцыяй і пагардай да банальнасці. Мне здаецца, што дарэмна некаторыя даследчыкі гісторыі тэатра літаральна тлумачаць цытаты са стэнограм, асабліва, супроцьстаўляючы Е. Міровіча Л. Літвінаву. Гэта ж добра, што ў тэатры працавалі **розныя** і добрыя мастакі. Пры ўсіх выдатках творчай канкурэнцыі з М. Зоравым, К. Саннікавым і Л. Рахленкам зробленае ў тэатры Л. Літвінавым уносіла дух заўсёднай незадаволенасці і фарміравала высокую прафесіянальную культуру творчасці калектыву.

Старанна захоўваў ён у сваіх пастаноўках беларускі нацыянальны характар нашага сцэнічнага мастацтва. Спашлюся хоць бы на такі аўтарытэт, як прафесар М. Марозаў, які пісаў аб прэм'еры «Рамеа і Джульеты» ў Мінску: «Спектакль «Рамеа і Джульета» ў пастаноўцы Л. Літвінава ў Беларускім драматычным тэатры імя Янкі Купалы—гэта не Шэкспір бурных і палымяных страсцей, яркіх маналогаў і рэзкіх кантрастаў. Не той Шэкспір, у якога, паводле слоў аднаго з сучаснікаў драматурга, «трагік стаіць на дыбачках, а комік скача вярхом». Гэты спектакль узнаўляе тое, што закладзена ў самой прыродзе беларускага тэатральнага мастацтва — мяккасць, лірычную задуменнасць, імкненне да праўдзівай перадачы шчырых чалавечых пачуццяў. Ён захапляе задушэўнасцю і музычнасцю. Любоўнікі ў ім не дэкламіруюць, мова іх не ўпрыгожана эўфуізмамі, комікі старанна абмінаюць вострыя вуглы гратэска. Герої і комікі не стварацца тых двух умоўных сцэнічных светаў «паэзіі» і прозы», пра якія некалі так многа пісалі шэкспіраўцы. Усе тут жывуць у адзіным свеце сцэнічнага рэалізму. Беларускі тэатр імя Янкі Купалы здолеў па-свойму паказаць трагедыю Шэкспіра...» А ў газеце «Правда» падкрэслівалася, што наш тэатр прачытаў класічны твор свежымі вачыма «не дзеля пустога арыгінальнічання, а дзеля найбольш поўнага раскрыцця ў ім тых ідэй, якія і дагэтуль захоўваюць асабліва дзейснае значэнне...»

Я сказаў бы, што ўся творчасць Літвінава была—не дзеля пустога арыгінальнічання. У пяцідзесятым годзе ён пакінуў родны тэатр і пераехаў у Казань, дзе на сцэне Вялікага тэатра імя В. І. Качалава паставіў больш трыццаці спектакляў. У яго пісьмах, якія ён пасылаў сваім сябрам і вучням, вельмі настойліва трымцела адна нота — ён перадаваў яе радком Купалы: «Мне сняцца сны аб Беларусі». І хоць там, у Казані, яму спадарожнічаў поспех, і гэта радавала нас, усё ж многія купалаўцы і прыхільнікі гэтага тэатра чакалі, што ён яшчэ ўварвецца ў рэпетыцыйную залу, як заўсёды агністы і ўзрушаны, нецярплівы і дынамічны, што ён будзе настройваць на высокі лад чарговы спектакль і падкажа артыстам нешта ўладарна натхняючае...

Шэсць гадоў назад Леў Маркавіч памёр. На магільным камені высечана — заслужаны дзеяч мастацтваў Беларускай ССР і Татарскай АССР.

Так, ёсць у нас перакананне, што творчасць рэжысёра даволі эфемерная, няўстойлівая ў вачах тых, хто сочыць за ёй «збоку». Магчыма, гэта і справядліва, калі гаварыць пра асобныя спектаклі: калі ж разглядаць яе як **паводзіны** чалавека ў мастацтве, дык трэба сказаць, што «літвінаўскае» ў дзейнасці тэатра імя Я. Купалы не знікае, а вельмі своеасабліва і арганічна ўваходзіць у традыцыі гэтага калектыву, які ў лепшых сваіх работах не абмяжоўваецца азбукай і арыфметыкай акцёрскага майстэрства, а творча раскрывае драматургічныя творы, імкнецца да значных сацыяльных абагульненняў і шукае яркую сцэнічную форму. Сярод рэжысёраў, якія закладалі падмурак гэтай традыцыі, быў і Леў Маркавіч Літвінаў.

Госць МІНСКА

УНІВЕРСАЛЬНАСЦЬ

У мінулым тэатральным сезоне мы слухалі ў Мінску салістку Ла Скала, выдатную спявачку, лірыка - каларатурнае сапрана Маргарыту Гульльмі, якая выступала ў партыях Джыльды ў оперы Д. Вердзі «Рыгалета» і Разіны ў оперы Д. Расіні «Севільскі цырульнік». І вось новая сустрэча — прыма міланскага тэатра Ла Скала Дызма ды Чэка.

Майстэрства італьянскіх оперных спевакоў даўно вядома ва ўсім свеце. У асаблівых рэкамендацыях не маюць патрэбы і салісты тэатра Ла Скала. Але хочацца сказаць некалькі слоў аб іх універсальнасці.

У операх «Аіда» Д. Вердзі і «Багема» Д. Пучыні на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Беларускай ССР выступіла вядучая салістка Міланскага тэатра Ла Скала Дызма ды Чэка.

На здымку: Дызма ды Чэка ў ролі Аіды і народны артыст БССР А. Генералаў у ролі Аманасра ў спектаклі «Аіда».

Кожны, хоць колькі-небудзь знаёмы са спецыфікай опернага мастацтва, прачытаўшы гастрольную афішу і яшчэ не ведаючы ні голасу, ні майстэрства спявачкі, можа выказаць здзіўленне перад яе універсальнасцю—побач назвы дзвюх партый, якія Дызма ды Чэка выконвае ў Мінску: гэта Аіда з аднайменнай оперы Д. Вердзі і Мімі ў оперы Д. Пучыні «Багема».

Партыя Аіды — тыповая партыя драматычнага сапрана, але паколькі драматычнае сапрана — рэдкасць, яе спяваюць і лірыка-драматычныя сапрана. Партыя ж Мімі выконваецца лірычнымі сапрана. Але амаль не бывае выпадкаў (за рэдкім выключэннем), каб спявачка, якая выконвае Мімі, спявала і Аіду.

У Італіі такія выпадкі—звычайная справа.

Відаць, не без карысці для абодвух бакоў адбываецца абмен паміж Вялікім тэатрам Саюза СССР і тэатрам Ла Скала, калі ў Ла Скала едуць на стажыроўку нашы лепшыя вакалісты, а ў Вялікім тэатры стажыруюцца італьянскія артысты.

І вось Аіда.

На працягу амаль ста гадоў (першая пастаноўка оперы адбылася 24 снежня 1871 года) партыя Аіды — адна з любімейшых у рэпертуары ўсіх драматычных сапрана. Не з'яўляецца, відаць, выключэннем з гэтага правіла і Дызма ды Чэка, хоць мне здалося, што голас яе — не драматычнае сапрана, а хутчэй лірычнае. Калі Аіда — адна з самых любімых партый, дык яна і адна з самых цяжкіх. Тут ёсць «што» спяваць, гэтак жа як і ёсць магчымасць прадэманстраваць усе галасавыя, выканаўчыя і акцёрскія дадзеныя.

Маналог Аіды з першай дзеі — адзін з лепшых эпізодаў оперы. У ім глыбока раскрываецца духоўны свет гераіні, уся складанасць яе супярэчлівых пачуццяў. У гэтай сцэне Дызма ды Чэка, валодаючы кантыленай гуку, спалучае яе з рэчытатыўнай выразнасцю. Нават не ведаючы італьянскай мовы, слухачы здагадваюцца, што гэта споведзь аб глыбіні перажыванняў гераіні.

Раманс Аіды з III дзеі — цудоўная лірычная песня з псіхалагічным зместам: светлыя ўспаміны аб далёкай радзіме ў момант, калі жыццёвая трагедыя набліжаецца да развязкі. Ідылічныя ўспаміны перапыняюцца выбухамі страснага смутку: «Oh patria mia...». Трэба сказаць, што раманс Аіды, апрача верхняга до, якое прагучала некалькі напружана для лірычнага сапрана, гэтак жа, як і дуэты Аіды з Аманасра і Радамесам, на мой погляд, найбольш удалыя месцы з усёй партыі спявачкі.

У фінальнай сцэне оперы дзеяння ўжо няма. Фінал — гэта светлы дуэт паміраючых закаханых, навекі замураваных у каменнай магіле. Тут павінен пануваць толькі «яго вялікасць» вакал. І Дызма ды Чэка дэманструе добрае італьянскае bel canto. На фоне празрыстай гучнасці аркестра льецца лёгкая мелодыя перадсмяротных летуценняў Аіды... Трэба сказаць, што ў гэтым дуэце добра зліваліся па тэмбрах галасы Дызмы ды Чэка і Зіновія Бабія. Гэтаму, вядома, садзейнічае і музыка дуэта— цудоўная па прыгажосці, адна з вяршынь у творчасці Вердзі.

Дызма ды Чэка мела вялікі поспех у публікі. Гэты поспех з ёй па праву падзялілі і яе партнёры па сцэне, якія на гэты раз былі на ўзроўні салісткі Ла Скала: народны артыст БССР З. Бабій — Радамес, народны артыст БССР А. Генералаў — Аманасра і заслужаная артыстка БССР П. Дружына — Амнерыс.

Анатоль ЦЫРКУНОЎ.

ПАЧАТАК ГАСТРОЛЬНАГА ТУРНЭ

12 красавіка ў сталіцы Беларусі пачала сваю гастрольную паездку па Савецкаму Саюзу вядомая польская спявачка Зофія Януковіч. У праграме артысткі творы Гендэля, Шуберта, Чайкоўскага, Дэбюсі, Лютаслаўскага. Пасля выступлення ў Мінску артыстка выступіць у Вільнюсе, Ленінградзе, Сухумі, Сочы і Маскве.

ГУЧЫЦЬ «МАНФРЭД»

СІМФОНІЯ «Манфрэд» Чайкоўскага — рэдкая госця на сімфанічнай эстрадзе. Апошні раз яна гучала ў Мінску гадоў дзесяць таму назад. З тым большай цікавасцю чакалася яе сёлетняе выкананне.

Чайкоўскі быў вялікім майстрам праграмнай сімфанічнай музыкі. Дастаткова ўспомніць такія яго шэдэўры, як увертюра-фантазія «Рамео і Джульета» і сімфанічная паэма «Франчэска да Рыміні». Побач з імі варта назваць і сімфонію «Манфрэд».

Ідэю напісаць сімфонію па матывах драматычнай паэмы Джорджа Байрана «Манфрэд» належала Балакіраву, які напісаў для Чайкоўскага разгорнутую літаратурную праграму будучай сімфоніі ў чатырох карцінах. Чайкоўскі не адразу адгукнуўся на прапанову Балакірава; праграма яго не натхніла. Толькі праз некалькі гадоў, пасля падарожжа ў 1884 годзе ў Швейцарыю, пабыўшы ў тых месцах швейцарскіх Альп, дзе разгортваюцца фантастычныя і рамантычна-прыўзнятыя падзеі паэмы Байрана, Чайкоўскі прыняўся за ажыццяўленне гэтай складанай творчай задумы.

Кампазітар не да канца быў задаволены сваёй работай. Ён высока ацэньваў першыя дзве часткі сімфоніі і вельмі крытычна ставіўся да трэцяй і, асабліва, чацвёртай часткі. Тут прычынай супраўдная сціпласць і самакрытычнасць вялікага кампазітара. Сімфонія «Манфрэд» — твор высокіх мастацкіх вартасцей, хоць нельга не прызнаць, што ў фінале часам адчуваецца перавага майстэрства над натхненнем.

Усё гэта ставіць перад дырыжорам нямала цяжкіх інтэрпрэтатарскіх задач. Ды і для аркестра партытура «Манфрэда» даволі складаная.

Дырыжор Юрый Яфімаў здолеў пераадолець гэтыя цяжкасці. Гучанне сімфоніі ў цэлым зрабіла ўражанне. Адчуваецца, што музыка такога характару блізкая да творчых схільнасцей дырыжора. Эпізоды, звязаныя з вобразам Астарты, некалі каханай Манфрэда, прагучалі паэтычна і высакародна. Ды і другая частка — віртуознае скерца, якое малюе «альпійскую фею ў вясёлцы з пырскаў вадаспада»,— наогул удалася, хоць драўляным духавым крыху не хапала тонкасці і лёгкасці гучання.

Піяніст В. Касцельскі.

Цяжкую праблему прадстаўляе выкананне фіналу сімфоніі. Пасля кульмінацыйнага эпізоду, у якім паказана смерць Манфрэда, ідзе прасветлены эпілог; тут гучыць арган, музыка паступова цішэе.

У Мінску гэты эпілог ні разу не гучаў. Па-першае, не было аргана; па-другое, дырыжоры часам баяцца гэтага «ціхага заканчэння» і лічаць за лепшае завяршыць сімфонію на патэтычнай кульмінацыі. Аднак гэта парушае аўтарскую задуму. Ю. Яфімаў выканаў фінал у аўтарскім арыгінале — з арганам і «ціхім заканчэннем», што несумненна лепш, хоць і выглядае знешне менш эфектна.

Наступным творам праграмы быў Другі фартэпіянны канцэрт Рахманінава. Шмат разоў гучаў на нашай сімфанічнай эстрадзе гэты вялікі твор — адна з агульнапрызнаных вяршынь сусветнай фартэпіяннай музыкі. І кожны раз слухаеш яго з вялікай асалодай. Такая ўласцівасць музычнага мастацтва. Добрую кнігу прачытаеш тры-чатыры разы. А добрую музычную п'есу ахвотна слухаеш і ў дзесяты і ў соты раз. Асабліва калі выканаўца валодае яркай індывідуальнасцю.

На гэты раз салістам-піяністам быў педагог Маскоўскай кансерваторыі, лаўрэат трох міжнародных конкурсаў (у Варшаве, Парыжы, Мюнхене) Валерый Касцельскі, які ўпершыню выступіў з Дзяржаўным сімфанічным аркестрам БССР. Гэта тонкі музыкант, які выканаў канцэрт Рахманінава ў строга-стрыманай манеры, без віртуозных лішкаў і пераўвелічэнняў пачуццяў. Усё гучала адухоўлена і высакародна і паказала высокі густ піяніста. Але часам не хапала рахманінаўскага разліву эмоцый, а некаторыя тэмы здаліся залішне стрыманымі. Толькі іншы раз дазваляў сабе саліст «вырвацца на волю» і аддацца такім характэрным рахманінаўскім спружыністым рытмам і натуральнаму патоку цудоўных шырокіх мелодый.

У сімфоніі «Манфрэд» і ў рахманінаўскім канцэрце ёсць многа сольных эпізодаў у аркестравых інструментаў. Былі тут і прыкрыя кляксы (фаготы яўна не падзілі з раялем), было і добрае: шматлікія і адказныя валторнавыя сола выдатна выканаў Э. Фарбераў.

Леў АЎЭРБАХ.

ФЕСТЫВАЛЬ У СОПАЦЕ

Курортны гарадок Сопат на беразе Балтыйскага мора жыве падрыхтоўкай да традыцыйнага фестывалю, які атрымаў афіцыйную назву «Міжнародны фестываль эстрадчай песні». Ён адбудзецца 21—24 жніўня сёлета.

Заяўкі аб удзеле ў фестывалі паступілі ўжо ад Савецкага Саюза, Балгарыі, Венгрыі, Мексікі, Бельгіі, Францыі, Галандыі, Швейцарыі, Чылі, Югаславіі, Швецыі, Туніса.

Галоўную прэмію фестывалю — «Янтарнага салаўя» — атрымаюць лепшыя кампазітар і выканаўца песні Сопацкі фестываль карыстаецца вялікай папулярнасцю ў Народнай Польшчы. У дні фестывалю колькасць тэлеглядачоў павялічваецца ў шмат разоў.

Смерць Габрыэля Шэвалье

У Канах ад сардэчнага прыступу памёр днямі вядомы французскі пісьменнік Габрыэль Шэвалье.

За сваю доўгую літаратурную дзейнасць Шэвалье напісаў добры дзесятак раманаў. Аднак сапраўдную славу прынёс яму «Скандал ў Клашмерлі». З надзвычайным майстэрствам пісьменнік даў жывую і з'едлівую сатырычную карціну правінцыяльнага французскага жыцця. Напісаны ў 1934 годзе, раман «Скандал у Клашмерлі» захаваў сваю актуальнасць да нашых дзён. Ён зрабіў трыумфальнае шэсце па ўсім свеце, будучы выдадзеным на 27 мовах велізарным для французскага рамана тыражом у 2 300 000 экземпляраў.

«Скандал у Клашмерлі» быў экранізаваны. Фільм з поспехам эканстраваўся ў Савецкім Саюзе.

Р. СЯРЭБРАНІКАЎ, карэспандэнт ТАСС.

Парыж.

У МАЙСТЭРНІ ПОЛЬСКАГА МАСТАКА

Творчая майстэрня Уладзімежа Закшэўскага — сапраўдная мастацкая галерэя. Са сваіх зарубежных паездак мастак прывозіць палотны, на якіх узнаўляецца аблічча вуліц і плошчаў, бульвараў і скверaў розных гарадоў Еўропы. Але самая буйная, дарагая для мастака работа — цыкл «Па ленінскіх месцах», пачаты яшчэ ў 1953 годзе.

— Па-сапраўднаму з творамі Леніна я пазнаёміўся ў 1934 годзе ў беластоцкай турме, калі ў мае рукі трапіла кніга «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме», пераплеценая ў вокладкі кнігі пад іншай назвай, — успамінае мастак. — У яго творах мне асабліва падабалася даходлівасць і пераканаўчасць. Доўгі час мяне захапляла думка стварыць серыю карцін, прысвечаных месцам, дзе бываў Уладзімір Ільіч.

У калекцыі карцін, аб'яднанай агульнай назвай «Па ленінскіх месцах», некалькі сотняў работ. Для стварэння такой вялікай калекцыі неабходна была напружаная праца. Каб адлюстраваць у жывапісе месцы знаходжання Леніна, мастак праехаў 80 тысяч кіламетраў, пабываў у СССР, Бельгіі, Францыі, Швейцарыі, Італіі, Германіі, Чэхаславакіі, Аўстрыі, Англіі. «Ленінскі цыкл — гэта важнейшы твор майго жыцця», — гаворыць ён.

У майстэрні мастака перада мной раскрываліся хвалюючыя старонкі жыцця і барацьбы правадыра сусветнага пралетарыяту. Пейзажы «Па ленінскіх месцах» нагадвалі кадры з дакументальнага фільма. Ім уласцівая і дакументальная дакладнасць і вялікая мастацкая выразнасць. Я ўслед за мастаком як бы рабіў захапляючае падарожжа ў мінулае, па месцах, якія нагадвалі пра Уладзіміра Ільіча.

Пошукі мастака працягваліся не адзін год. Аб гэтым перыядзе творчасці У. Закшэўскі гаворыць коратка: «Працаваў многа»... Але сказаць «працаваў многа» — гэта яшчэ нічога не сказаць. Ён жа стварыў больш як 3 тысячы карцін!

Калі я запытаўся ў яго, чым знамянальныя 50-я і 60-я гады ў яго жыцці, Уладзімеж Закшэўскі адказаў:

— 1957 год... Увогуле зрабіў больш як 50 ленінскіх пейзажаў. Наведаў Ульянаўск, Куйбышаў, Ленінград, Разліў, Горкі, Маскву, Пароніна, Кракаў, Новы-Тарг, Бялы Дунаец, Цюрых, Парыж, Прагу.

— 1958 год... 160 работ, у тым ліку 80 папоўнілі ленінскі цыкл: дамы, дзе жыў і тварыў Уладзімір Ільіч, месцы партыйных канферэнцый і з'ездаў (Цымервальд і Лондан), будынкі, дзе ён сустракаўся з рэвалюцыйнымі дзеячамі, дом Максіма Горкага на Капры, дом рускіх студэнтаў у Лейпцыгу, партыйная школа ў Ланжумо.

—1959 год... У Кракаве і Пароніне напісаў 20 пейзажаў.

— 1960 год — вясна ў Савецкім Саюзе, лета ў Польшчы...

— 1961 год... Зноў падарожжы і папаўненне ленінскага цыкла.

Уладзімеж Закшэўскі расказаў мне, што некаторыя месцы, звязаныя са знаходжаннем Ільіча, ён маляваў па дзесятку разоў, напрыклад, Красную плошчу, дом Леніна ў Кракаве.

— Адчуваю сябе ў Савецкім Саюзе, як дома, — усміхаючыся, гаворыць мастак. — Вось вы ў ТАСС працуеце. А я ж таксама стары тасавец...

Перада мной пажаўцелы ад часу дакумент, у якім напісана, што Уладзімеж Закшэўскі працаваў у «Вокнах ТАСС» у 1941—42 гадах. А вось і другі дакумент часоў вайны, які сведчыць, што У. Закшэўскі — член Саюза мастакоў СССР.

У 1939 годзе 23-гадовы камуніст Закшэўскі быў вызвалены з беластоцкай турмы савецкімі войскамі. Потым — Вялікая Айчынная вайна, работа на Алтаі, у Войску Польскім, дзе ён выпускаў плакаты з палымянымі заклікамі да барацьбы з фашызмам. Потым вяртанне з арміяй на радзіму і творчая дзейнасць.

Між іншым, вернемся да карцін мастака. Вось пейзажы Кракава. Ільіч прыехаў сюды ў чэрвені 1912 года і пасяліўся на краі горада ў бедным прадмесці Звежынец, каля Віслы. Кватэра была далёка ад вакзала, куды Ленін штодзень адвозіў свае пісьмы для адпраўкі ў Расію. Таму праз два месяцы ён пераехаў на вуліцу Любамірскага, бліжэй да вакзала. І па сённяшні дзень у Кракаве жыве некалькі чалавек, якія памятаюць Уладзіміра Ільіча. Дом захаваўся ў сваім ранейшым выглядзе. Такім ён і намаляваны на палатне Закшэўскага.

Калі глядзіш на другую карціну — «Парк Мансуры», успамінаецца пісьмо Леніна яго сястры ад 19 снежня 1908 года. «Кватэра на самым амаль краі Парыжа, на поўдні, каля парку Мансуры. Ціха, як у правінцыі». Мастак намаляваў любімае месца Ільіча ў парку — лаўку ля фантана, дзе ён часта сядзеў, зачытаўшыся.

Вялікае ўражанне робяць работы «Смольны ў Ленінградзе», «Узбяражжа Фінская заліва ля станцыі Разліў», «Дарога з Пароніна на Харэнду», якія вабяць свежасцю кампазіцыйнага рашэння і каларыту.

— Работу над ленінскім цыклам лічу яшчэ не закончанай. Сёлета паеду ў Фінляндыю, пабываю таксама ў Савецкім Саюзе, дзе рыхтуецца выстаўка маіх пейзажаў.. — гаворыць на развітанне Уладзімеж Закшэўскі.

В. КУЗНЯЦОЎ, карэспандэнт ТАСС.

РАДЖ КАПУР ЗДЫМАЕ ФІЛЬМ

АБ ТЫМ, што Радж Капур працуе над новай кінакарцінай, даведаешся адразу, з першых хвілін знаходжання ў Бамбеі. Ужо на шляху з аэрапорта ў горад на адным з паваротаў дарогі вас сустрэне велізарны рэкламны шчыт— вы бачыце, як ветліва ўсміхаецца артыст, добра знаёмы савецкаму гледачу. Ніжэй яркімі прыгожымі літарамі на мовах хіндзі і маратхі выведзена: Хутка! Хутка! Глядзіце на экранах — «Маё імя — клоун»! Мінут праз пяць знаёмая рэклама зноў мільгне ў акне аўтамашыны, потым яшчэ і яшчэ раз...

Рэклама. У Бамбеі, дзе жыве і працуе Радж Капур, яна неабходная. Тут знаходзяцца студыі буйнейшых індыйскіх кінакампаній, якія канкуруюць паміж сабой. І хоць Радж Капур — зорка першай велічыні ў індыйскай кінапрамысловасці і шырока папулярны ў гледачоў, але і яму даводзіцца загадзя непакоіцца аб поспеху сваіх будучых кінакарцін. Праўда, на гэты раз і без рэкламы цікавасць да фільма «Маё імя — клоун» надзвычай высокая. Тлумачыцца гэта ў значнай меры тым, што ў здымках фільма, прысвечанага цырку, прымае ўдзел вялікая група артыстаў маскоўскага цырка і салістка балета Вялікага тэатра СССР К. Рабінкіна. Па сцэнарыі, напісаным вядомым пісьменнікам К. А. Абасам, савецкія артысты, якія прыехалі на гастролі ў Індыю, іграюць істотную ролю ў лёсе героя фільма. Знаёмства з імі дапамагае яму пераадолець унутраныя сумненні і зрабіць рашаючы крок ў сваім жыцці — стаць артыстам цырка...

— Ідэю стварыць стужку аб нялёгкай прафесіі манежнага клоўна я выношваў даўно, — сказаў Капур. — Гэта мара ажыццявілася, калі я атрымаў цікавы сцэнарый К. Абаса, а потым здолеў пры садзеянні Міністэрства культуры СССР запрасіць у Бамбей савецкіх артыстаў. Іх ігрой я вельмі задаволены. Цудоўная чароўная балерына К. Рабінкіна, вышэй усялякіх пахвал клоўн Эдуард Серада, акрабаты Галіадзе, паветраная гімнастка Людміла Брэда. Можна шчыра сказаць, што фільм «Маё імя — клоун» — гэта сумесная работа савецкіх і індыйскіх артыстаў. Такім чынам, працягваецца плённае супрацоўніцтва, якое было пачата некалькі гадоў назад стварэннем савецка-індыйскай кінакарціны «Хаджэнне за тры моры».

В. БАЙКОЎ, карэспандэнт ТАСС.

Дэлі.

КАНЕЦ «ЗАГАДКІ ТРАВЕНА»

26 САКАВІКА 1969 года ў Мексіцы памёр пісьменнік Бруна Травен — адна з самых загадкавых фігур нашага часу. На працягу апошніх сарака гадоў многія літаратуразнаўцы і крытыкі беспаспяхова спрабавалі даведацца, хто ж хаваецца пад гэтым імем. Яго раманамі і аповесцямі, апавяданнямі і навелямі зачытваліся амаль ва ўсіх краінах. Яны вытрымалі больш як 500 выданняў на 36 мовах свету. Творы пісьменніка разыходзіліся мільённымі тыражамі.

З творчасцю Травена знаёмы і савецкія чытачы. У канцы 30-х гадоў на рускай мове з'явіліся яго раманы «Збіральнікі бавоўны», «Паўстанне павешаных», «Скарб С'ера-Мадрэ», «Праклятае золата». У 1959 годзе выдавецтва «Детгиз» выпусціла раман «Паход у краіну Каоба». У вераснёўскім нумары часопіса «Молодая гвардия» за 1965 год надрукаваны яго навела «Багіня грому і маланкі»...

Газеты прасілі пісьменніка раскрыць свае інкогніта, але ўсе дарэмна. Вакол імя Травена сталі складацца легенды. Існавала больш 20 версій яго біяграфіі. У канцы 1967 года ў ГДР нават выйшла аб'ёмістая праца «Бруно Травен. Матэрыялы да адной біяграфіі». Яе аўтар—літаратуразнаўца з Лейпцыга Рольф Рэкнагель, які шмат гадоў свайго жыцця прысвяціў «загадцы Травена». На пяцістах старонках вучоны спрабаваў даказаць, што Травен—не хто іншы, як нямецкі журналіст Рэт Марут, які назаўсёды знік з Германіі пасля падзення Баварскай Савецкай рэспублікі ў 1919 годзе. Гэта версія, як і іншыя, падверглася сумненню, а Травен так і застаўся неразгаданым.

Зусім заканамернае пытанне: навошта пісьменніку спатрэбілася такая таямнічасць? Для рэкламы? Або для чагосьці іншага. На гэтае пытанне Травен адказаў сорак гадоў назад. Калі ён упершыню прынёс свой рукапіс выдаўцам, тыя папрасілі яго расказаць аўтабіяграфію. Травен адмовіўся. «Я абсалютна не разумею,—заявіў ён,— чаму чытачы павінны цікавіцца асабістым жыццём пісьменніка, чаму падымаюць такі шум вакол яго імя. Я толькі работнік, такі ж, як і ўсе. Я абавязаны пісаць кнігі, як быў бы абавязаны вырошчваць хлеб, рабіць паперу для сваіх кніг». «Я павінен сказаць,—пісаў ён некалькі пазней у сваёй «Дэкларацыі незалежнасці», што я не больш варты, чым друкарскі рабочы, які набірае маю кнігу, чым жанчына - ўпакоўшчыца або пераплётчык маіх кніг. Без іх дапамогі і самаадданай працы чытачы не атрымалі б гэтых кніг, як бы добра яны ні былі напісаны».

І Травен стрымаў сваё слова. Да апошніх гадоў яго загадка так і не была разгадана.

Таму можна было зразумець хваляванне журналістаў, калі яны даведаліся, што ўдава пісьменніка Роса Елена Лухан аб'явіла аб прэс-канферэнцыі. І вось Роса Елена паведамляе прысутным просьбу Травена расказаць аб ім толькі пасля яго смерці

Б. Травен нарадзіўся ў 1890 годзе ў Чыкага ў беднай рабочай сям'і. Тут прайшлі яго дзіцячыя гады. Бацька будучага пісьменніка—нарвежац маці — англічанка. Яго сапраўднае імя і прозвішча паводле слоў удавы,—Травен Торсван. Цікава адзначыць, што пісьменнік паведаміў аб гэтым у інтэрв'ю карэспандэнту мексіканскага часопіса «Сьемпрэ». «Я б хацеў заўважыць,—сказаў ён,— што маё імя не Бруна, не. Гэта імя—не што іншае, як пустыя выдумкі крытыкаў і журналістаў... Імя ж маё—Травен, а прозвішча—Торсван...»

Значыць, не Бруна Травен, а Травен Торсван, і не немец, а амерыканец. Але чаму ж тады пісьменнік аказаўся ў Мексіцы, дзе пражыў больш за 20 гадоў? Чаму яго так доўга і настойліва лічылі немцам? Роса Елена адказала і на гэтыя пытанні. Сапраўды, Травен Торсван разам з бацькамі пераязджае ў Еўропу і пасяляецца ў Германіі. Там жа выходзіць і яго першая кніга «Карабель смерці», якая прыцягвае ўвагу крытыкаў і чытачоў. Гэта акалічнасць і паслужыла прычынай таго, што яго доўгі час лічылі немцам.

Потым пісьменнік пераязджае ў Мексіку. У першыя гады яму давялося вельмі цяжка. Травен жыў у джунглях і пустынях, у гарэдах і портах Мексікі. Выконваў самую разнастайную работу. Але, як ён сам потым прызнаўся, усё гэта дапамагло яму вывучыць краіну, яе жыхароў, норавы і звычаі Мексікі. «Той, хто хоча пазнаць душу народа, — гаварыў пісьменнік,— яго жыццё, песні, любоў і смяротную нянавісць, не павінен жыць у Рэджыс-атэлі ў Мехіка, ён павінен паглыбіцца ў джунглі».

У 1950 годзе Травен Торсван атрымлівае мексіканскае грамадзянства. З гэтага часу ўся творчасць цалкам належыць Мексіцы. Ён з любоўю расказвае аб простых мексіканцах, асуджае расізм і тыранію. Пісьменнік паказаў, як гераічны «мексіканскі пралетарый—індзеец змагаецца за сваё вызваленне, за тое, каб прабіцца да святла сонца». І чытачы па вартасці ацанілі сімпатыі пісьменніка да простых мексіканцаў. Нездарма адзін часопіс прызнаваў, што «ні адзін мексіканскі пісьменнік, ні адзін іншаземец яшчэ не паказваў мексіканскую рэчаіснасць з такой праўдзівасцю, як гэта ўдалося зрабіць Травену».

Прэс-канферэнцыя закончана. Удава пісьменніка дзякуе журналістам за ўвагу і ў заключэнне паведамляе аб апошняй волі Травена Торсвана: ён папрасіў, каб яго прах быў развеяны над правінцыяй Чыапіс, дзе ён пражыў доўгія гады сярод індзейцаў.

А. МЯДЗВЕДЗЕНКА, (ТАСС).

Навіны кіно

«РАСПЯТЫ ВОСТРАЎ»

...Кожны год чацвёртага мая ў пяць гадзін вечара на маленькім галандскім востраве Тэксель, што ў Паўночным моры, на дзве мінуты спыняецца рух транспарту. У жалобным маўчанні людзі застываюць ля помніка, на якім на рускай і грузінскай мовах напісана: «Тут пахаваны храбры воін, савецкі капітан Шалва Лаладзе і яго баявыя сябры з слаўнага выстаўка батальёна, якія да апошняй кроплі крыві змагаліся за свабоду супраць нямецкіх захопнікаў на востраве з 6 красавіка па 18 мая 1945 года».

Больш як пяцьсот чалавек загінулі тады ў смяротнай бітве з ворагам. Толькі некалькім дзесяткам палонных байцоў з грузінскага батальёна давялося вярнуцца на радзіму...

Па матэрыялах гэтых трагічных падзей грузінскі драматург Рэваз Табукашвілі напісаў п'есу «Распяты востраў», пастаноўку якой ажыццявіў Тбіліскі тэатр імя Ш. Руставелі. Па яго ж сцэнарыі кінарэжысёр Шата Манагадзе на студыі «Грузія-фільм» зняў мастацкую карціну «Распяты востраў».

Гэты фільм дэманструецца ў кінатэатрах рэспублікі і неўзабаве выйдзе на ўсесаюзны экран.

Леў ГОЛЬДЗІНАЎ, карэспандэнт АДН.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

15 красавіка

Першая праграма. 9-10—тэлебачанне—школе. Фізіка. 10-ы клас. «Будова атама». 9-40—«Калі стралкі ўставалі ў бой». Кінанарыс. 10-00 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15—«Актуальныя праблемы эканомікі». Перадача з Волгаграда. 10-45—тэлевізійны тэатр мініяцюр. «13 крэслаў» (М). 16-55—праграма перадач. 17-00—тэлевізійныя навіны (М). 17-15 — для школьнікаў. «Вуліца ў кватэры». 17-50—«Панарама навін». 18-15—«Дарогамі вясны». Рэйд-агляд Беларускага тэлебачання. 18-30 — «Прапагандысты ленінскай школы». Я. М. Свярдлоў (М). 19-00—фестываль савецкіх і зарубежных шматсерыйных тэлевізійных мастацкіх фільмаў. «Угрум-рак...». Прам'ера. 1-я серыя (М). 20-30—«Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15—«Кампазітар і экран». Музыка А. Пятрова ў кіно (М). 22-30—«Звязда». Тэлевізійны часопіс. 23-20—«Пад сцягамі дзеяўці краін». Кінарэпартаж аб традыцыйных спаборніцтвах на прыз газеты «Комсомольская правда».

Другая праграма. 17-15—«Народныя майстры прыкладнога мастацтва». Перадача з Рыгі. 18-00—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Музычны пераморк». Перадача з Пярмі. 18-30—«Пра дзікіх аленяў і пастуха Кармазіна». Кінанарыс. 18-45—«У свеце танца». Музычны фільм. 19-50—«Атам на новай рабоце». «Чалавек і атам». Навукова-папулярныя фільмы. 21-10 — «Вечны календар». Мастацкі фільм. 22-30—«Старонкі музычнага календара». Балет А. Крэйна «Лаўрэнсія» (М). 23-00—«Па першынство свету па шахматах». Дзённік. Перадача з Тбілісі. 23-15—навіны, каментарыі. Праграма перадач.

16 красавіка

Першая праграма. 9-10—тэлебачанне—школе. Біялогія. 10-ы клас. «Генетычныя асновы селекцыі». 9-40—«Сорак крокаў». Кінанарыс. 10-00 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15—«Табе, юнацтва!». Перадача з Алэсы. 10-45—«Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 11-15 —балгарскія народныя песні і танцы. Канцэрт. Перадача з Сафіі. 15-45—праграма перадач. 15-50 — школьная фільматэка. «Майская ноч». Мастацкі фільм. 17-00—«Па шляху прагрэсу». Пра інстытут навуковай і тэхнічнай інфармацыі. 17-30—«Памяць Сімбірска». Расказ аб трох фотаздымках У. І. Леніна. 18-00—«Хімія і ўраджай». Агульнасаюзны рэпартаж (М). 19-00—чэмпіянат СССР па футболу. «Дынамо» (Кіеў)—«Дынамо» (Масква). Перадача з Кіева. У перапынку—«Панарама навін». 20-45 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15— «Дарогамі вясны». Рэйд-агляд Беларускага тэлебачання. 21-25 — «Здачынца пакідае след». Шырокаэкранны мастацкі фільм. 22-50 — універсітэт педагагічных ведаў. «Вучыце дзяцей правільна гаварыць». 23-10—«Хроніка музычнага жыцця рэспублікі. Год 1960-ы».

Другая праграма. 17-00—«Новыя імёны на оперній афішы». Перадача са Свярдлоўска. 17-30 — «Ота Куусінен—салдат рэвалюцыі». Перадача з Петразаводска. 18-00 — для школьнікаў. «Паўлік Марозаў». Тэлевізійны спектакль. 19-45 — тэлевізійныя навіны (М). 20-00—па родной краіне. «Добры дзень. Ашхабад». «Горад сонца». Кінанарысы. 20-45—экран—завочнікам. Гісторыя КПСС. «Партыя — арганізатар перамогі Савецкай улады па ўсёй краіне. Барацьба партыі за выхад з імперыялістычнай вайны». 21-15—праграма каляровага тэлебачання. Перадача з Кіева. 22-15 — у эфіры — «Маладосць». «Гарызонт». Перадача з Ленінграда. 23-15—«На першынство свету па шахматах». Дзённік (М). 23-30 — навіны, каментарыі. Праграма перадач.

17 красавіка

Першая праграма. 16-45 — праграма перадач. 16-50 — тэлевізійныя навіны (М). 17-00—«На актуальныя тэмы» (М). 17-30 — для школьнікаў. «Д'Артаньян прыйшоў на сцэну». 18-00 — «Панарама навін». 18-15 — «Дарогамі вясны». Рэйд-агляд Беларускага тэлебачання. 18-30—«Маршрутамі пяцігодкі» (М). Уключэнне Мінска. 19-00—паказальныя выступленні пераможцаў і прызёраў чэмпіянату свету па фігурнаму катанню. Перадача з Ленінграда. У перапынках—тэлевізійныя навіны (М). 22-00—«Паэма пра нявыдуманага героя». Вобраз камуніста на савецкай сцэне. Перадача з Цэнтральнага Дома акцёра імя А. А. Яблачкіна (М). 23-30—навіны, каментарыі. Праграма перадач.

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Не забудзьце павіншаваць сваіх родных, сяброў і знаёмых з Днём міжнароднай салідарнасці працоўных — 1 Мая!

ПРАДПРЫЕМСТВЫ СУВЯЗІ З 16 ПА 20 КРАСАВІКА ПРЫМАЮЦЬ ВІНШАВАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ І ФОТАТЭЛЕГРАМЫ

ПА ЛЬГОТНАМУ ТАРЫФУ

ў два разы дзешавей, чым звычайна

І забяспечваюць іх дастаўку адрасатам у дзень, указаны адпраўніком. Ва ўсіх прадпрыемствах сувязі ёсць вялікі выбар паштовак.

Не адкладвайце адпраўку віншаванняў на апошнія перадсвяточныя дні, таму што прадпрыемствы сувязі з прычыны вялікай перагрузкі гарантаваць своечасовую іх дастаўку не могуць.

АДПРАЎЛЯЙЦЕ ВІНШАВАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ, ПІСЬМЫ І ПАШТОЎКІ ЗАГАДЗЯ.

Міністэрства сувязі БССР.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыемная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25 адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53 аддзела тэатра кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры выяўленчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04 аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда». Індэкс 63856. АТ 08616

Літаратура і мастацтва 4

Аўторак, 15 красавіка 1969 года.